

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

РАМАН САВІЦКІ ☞ 4

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 38 (2523) Год XLIX | Беласток, 19 верасня 2004 г. | Цана 2,00 зл.

Гміны, паводле Нацыянальнага перапісу ад 2002 г. (падлікі ў працэнтах), дзе пражывае 8 і болей працэнтаў насельніцтва, якое прызнаецца да беларускасці: **Гарадок (23,07) • Заблудаў (8,48) • Міхалова (14,17) • Бельск-Падляшскі — горад (20,66) • Бельск-Падляшскі — гміна (46,68) • Орля (68,93) • Белавежа (11,54) • Гайнаўка — горад (26,41) • Гайнаўка — гміна (64,91) • Дубічы-Царкоўныя (81,33) • Кляшчэлі (41,83) • Нараўка (47,27) • Нарва (49,23) • Чаромха (28,71) • Чыжы (81,81) • Мілейчычы (13,09) • Нурэц-Станцыя (16,36) • Боцькі (8,11).**

Двухмоўе

Урэшце, пасля 11 гадоў дэпутацкіх прац, з'явіўся шанц, каб яшчэ сёлета быў прыняты Сеймам закон аб нацыянальных і этнічных меншасцях ды аб рэгіянальнай мове. Як кажа яго спікер, дэпутат Яўген Чыквін (СЛД), галасаванне ў гэтай справе можа адбыцца да Каляд.

— Гэты закон мае ўрэшце шанц быць прынятым, паколькі СЛД упісаў яго ў каталог прыярытэтаў тэрміну паўнамоцтваў гэтага Сейма.

Найважнейшыя пытанні ў законе, не вырашаныя да гэтай пары, датычаць ужывання мовы меншасці. Значыць, будзе можна карыстацца запісам імён і прозвішчаў у адпаведнасці з прынцыпамі беларускага правапісу ў актах грамадзянскага стану і дакументах тоеснасці. Закон гарантуе свабоднае карыстанне беларускай мовай у прыватным жыцці і публічным ужытку, распаўсюджванне на ёй усёй інфармацыі. Перад органамі гміны можа яна ўжывацца як дапаможная. Тут, аднак, ёсць агаворка, што так можа быць у гмінах, у якіх беларусы складаюць не менш чым 8 адсоткаў ад агульнай колькасці насельніцтва. Такіх гмін на Падляшшы больш за дзесяць (глядзі: табліца). Значыць, беларусы могуць звяртацца ў гмінныя органы па-беларуску ў пісьмовай форме (заявы, прашэнні), а таксама вусна (паводле закону: *na wyraźny wniosek*). Гэта значыць, што ў гмінных установах мусяць быць прыняты на працу асобы з пасведчаным веданнем беларускай мовы, а з гэтай прычыны атрымаюць дабаўку.

Згодна з законам, назвы ў беларускай мове могуць быць ужыванымі побач афіцыяйых назваў мясцовасцей, вуліц, назваў устаноў і інстытутаў публічнага карыстання. Гэта датычыць таксама гмін, дзе меншасць складае не менш чым 8 адсоткаў насельніцтва. Адно: гэтае рашэнне залежыць ад рады гміны, якая сама па сабе можа падаць заяву або да рады можа звярнуцца з заявай група жыхароў прадстаўляючых меншасць.

Унесены ў праект закону м.інш. запіс аб назначэнні пры прэм'еры рэкамендацыйна-дарадчыцкага органу: Супольнай камісіі ўрада і нацыянальных меншасцей. Ад беларусаў мае быць двух прадстаўнікоў. У сваю чаргу міністр унутраных спраў назначыць упаўнаважанага па справах веравызнанняў і нацыянальных меншасцей.

Канчатковы варыянт закону ўжо ў час прац у камісіях сустрэў супрацьстаянне з боку каталіцкай *правіцы*. На адным з найбліжэйшых пасяджэнняў Сейма мае быць прагаласаваных найменш 25 паправак, заяўленых дэпутатамі ад Каталіцка-нацыянальнага руху (RKN) і Лігі польскіх сем'яў (LPR). Галоўным чынам залежыць ім, каб павысіць колькасны парог (з 8% на 50%) жыхароў меншасцей у мясцовасцях, у якіх маюць абавязваць двухмоўныя назвы і дзе справы можна будзе афармляць на мове меншасці (дапаможнай).

— Меншасць не можа дыскрымінаваць большасці! — грымеў на адным з пасяджэнняў трох сеймавых камісій, якія працавалі над законам, дэпутат ад RKN Антоні Стрыеўскі.

Падтакваў яму ў размове з „Нівай" падляшскі дэпутат ад LPR Анджэй Фэдаровіч:

— Жывем у польскай краіне і мы павінны карыстацца польскай мовай. За абавязкам карыстацца ва ўстановах мовай меншасці стаіць ахвота даць працу „сваім".

Пры нагодзе дэпутат Фэдаровіч дадаў без канфузу:

— Я — вораг распаўсюджвання карыкатурных моў меншасцей, якімі карыстаецца Тэлебачанне Беласток. Гэтае балбатанне абражае шмат якія нацыі.

Стрымана ў справе закону азываецца сенатар Кшыштаф Юргель (PiS), ранейшы дэпутат, вядомы з незычлівых выказванняў аб беларусах:

— Пакуль што, не хачу выказвацца. Трэба пазнаёміцца з усімі аргументамі.

Асцярожнымі ў выказваннях былі прадстаўнікі самаўрадаў, якіх мы распытвалі. Войт Чаромхаўскай гміны Міхал Врублеўскі, якога ў іншай справе турбавалі раней журналісты, сказаў толькі:

— Не буду выказваць свае пазіцыі. Яшчэ прышыюць мне палітычную латку!

Сакратар Управы гміны Бельска-Падляшскага Раіса Раецкая:

— Вы мяне заспелі. Не ведаю, што адказаць. Пэўна, будуць патрэбны грамадскія кансультацыі.

Міхал Андрасюк — радны Гайнаўскага павета, а заадно шэф Беларускага самаўрадавага форуму — упэўнены ў патрэбе ажыццяўлення закону на практыцы, у тым ліку — падвойных назваў:

— Як Беларуска-народны выбарчы камітэт і Форум будзем пераконваць наконт гэтага самаўрады і клубы. Наколькі ведаю, дасюль такая ідэя не мела большай падтрымкі.

На думку Міхала Андрасюка, праблемай будзе магчымасць карыстання беларускай мовай ва ўстановах.

— З веданнем беларускай мовы чыноўнікамі — ненайлепш, хоць некаторыя з іх — выпускнікі беларускіх ліцэяў у Гайнаўцы ці Бельску.

Дэпутат Яўген Чыквін асцерагае:

— Не спяшаймася! Найперш трэба пераканаць польскую большасць у тым, што пасля ўвядзення падвойных назваў ці карыстання мовай меншасці ва ўстановах нічога ёй не пагражае. Закон не можа выклікаць антаганізмаў.

Заявіў прытым, што з уласнага кашалька ўстановіць двухмоўную табліцу на гміннай установе ў Орлі, адкуль сам ён родам, вядома, калі адпаведнае рашэнне заявіць тамашняя Гмінная рада.

Аб тым, што ажыццяўленне закону не будзе простым і не абыдзецца без скрыгатання, можа ўжо сведчыць выказванне войта Міхалоўскай гміны Марка Назаркі:

— Афіцыйныя справы павінны афармляцца на польскай мове, паколькі мы жывем у Польшчы.

Меншасці былі палічаны ў час апошняга перапісу насельніцтва. У адпаведнасці з ім, палажэнні закону датычылі б на Падляшшы (таксама і ў Міхалове) беларусаў і ў невялікай частцы былое Сувальшчыны — літоўцаў.

Мацей Халадоўскі

Рэферэндум ☞ 2

Віктар Сазонаў

Калі прасачыць увесь ланцужок адносінаў Масквы да цяперашняй улады ў Беларусі, то становіцца відавочным, што менавіта гэтая ўлада патрэбна Крамлю. Расія апекавалася ёй ад самога пачатку, ратуючы ў крытычныя моманты, і падтрымліваючы на міжнародным палітычным полі. І цяпер Крэмль заявіў, што рэферэндум гэта ўнутраная справа Беларусі...

З'езд у Празе ☞ 2

Міхал Андрасюк

З'езд — водгук на новую сітуацыю, што стварылася з пашырэннем Еўрапейскага Саюза. Працэс аб'яднання затрымаўся на польска-беларускай граніцы, але ў межах Еўрасаюза, па розных меркаваннях апынуліся ад 300 да 700 тысяч нацыянальных беларусаў. Гэта эміграцыя (яна ўсё яшчэ папаўняецца новымі ўцекачамі) і таксама беларусы Беласточчыны ды Віленшчыны...

Казацкія напевы ☞ 5

Ганна Кандрацюк

Усяму вінавата ўкраінская песня! Яна тут усюды, куды не ступіш. У магазінах, у аўтобусах, на базарах, на вакзалах. Самы папулярны від — украінскае disco-polo — народная песня ў спалучэнні з рытмічна-схематычнай, проценькай мелодыяй...

Падляшскі кірмаш ☞ 8

Міра Лукша

Перад ратушай — сядзібай Падляшскага музея — паміж смакоццем — хлябамі ды булкамі, нарваўскімі агуркамі ды капустай (еўрасаюзны выраб!), мёдам і іншымі вырабамі пчол ды пітвом, пад музыку педальнай гармоні Маліноўскіх з вёскі Лазукі і Тыкоціна выставілі свае працы амаль трыццаць разьбяроў, ткачоў, маляроў на шкле, кавалёў...

Эпімах-Шыпіла ☞ 9

Лена Глагоўская

Браніслаў Эпімах-Шыпіла нарадзіўся 145 гадоў таму, 4 верасня, праўдападобна старога стылю (...) Беларусь сёлета святкуе падвойныя ўгодкі Браніслава Эпімаха-Шыпілы, таксама і 70-я ўгодкі смерці яго ў Ленінградзе 6 чэрвеня 1934...

Беларускія спартсмены ☞ 10

Уладзімір Хільмановіч

Суверэнная гісторыя айчыннай зборнай па футболе пачалася 28 кастрычніка 1992 года хатнім сяброўскім матчам супраць Украіны (1:1). Усяго за 12 гадоў нашыя згулялі 82 гульні (агульны баланс негатыўны — 21 перамога, 21 нічыя і 40 паразаў)...

9 770546 196000

Рэферэндум

7 верасня ў тэлезвароце да беларускага грамадства Аляксандр Лукашэнка абвясціў правядзенне рэферэндуму. Кіраўнік дзяржавы „папрасіў" грамадзянаў Беларусі даць яму права ўдзельнічаць у прэзідэнцкіх выбарах 2006 года. Гэтае паведамленне выклікала моцную пратэстную хвалю ў СМІ, як у Беларусі, так і па-за яе межамі. Але нікога не здзівіла. Усе яго чакалі і ніхто не сумняваўся, што яно будзе. Думкі палітычных аналітыкаў разышліся якраз не па пытанні, ці будзе гэты рэферэндум — тут усе былі аднадушнымі, што само па сабе ўжо сведчыць аб тым, што дзеянні цяперашняй улады поўнасцю прагназавальныя. Галоўныя спрэчкі ідуць вакол калярэферэндумнай тэмы.

Найперш, якія сілы стаяць за гэтым рашэннем. Многія палітыкі і журналісты прыпісваюць яго толькі Лукашэнку. Маўляў, дзеля захавання ўлады Аляксандар Рыгоравіч пайшоў супраць усяго свету. Выбраўшы той момант, калі ўвага Расіі была скіраваная на тэрарыстычны акт у Бяслане, ён, нібыта, падмануў яшчэ і Крэмль, дзе быццам зацікаўленыя ў змене кіраўніка беларускай дзяржавы. Але падобныя разважанні адарваныя ад рэчаіснасці і грунтуюцца на жаданні некаторых палітыкаў не пасварыцца з крамлёўскімі калегамі, якія вядуць двайную гульню. Робяць выгляд, што сябруюць і з Лукашэнкам, і з апазіцыяй. Калі прасачыць увесь ланцужок адносінаў Масквы да цяперашняй улады ў Беларусі, то становіцца відавочным, што менавіта гэтая ўлада патрэбна Крамлю. Расія апекавалася ёй ад самога пачатку, ратуючы ў крытычныя моманты, і падтрымліваючы на міжнародным палітычным полі. І цяпер Крэмль заявіў, што рэферэндум гэта ўнутраная справа Беларусі. Першы прэзідэнт РБ неяк сам заяўляў, што ён непераможны да таго часу, пакуль будзе карыстацца падтрымкай расійскага кіраўніцтва. Наўрад ці адважыўся б Лукашэнка на такі крок як рэферэндум, не атрымаўшы згоду ўсходняга суседа.

Час аб'яўлення рэферэндуму таксама быў абраны невыпадкова. І нічога агульнага з тэрактам у Бяслане ён не мае. Хіба толькі Расія можа прыкрывацца гэтым тэрактам на міжнароднай арэне, спісваючы на яго свае як быццам бы недапрацоўкі ў адносінах да Лукашэнкі. На самой справе час абвяшчэння рэферэндуму падбіраўся па іншых крытэрыях. Сама галоўнае было дамагчыся прызнання вынікаў рэферэндуму ў свеце. Таму Лукашэнка вельмі граматна ўцягнуў у выбарчую кампанію большасць апазіцыі, пачакаў, калі кандыдаты ад палітычных партый пададуць паперы на ўдзел у выбарах, запрасіў міжнародных наглядальнікаў, і толькі потым абвясціў аб правядзенні рэферэндуму. Зараз Лукашэнка мае ўсе падставы меркаваць, што з дапамогай усё той жа Расіі вынікі рэферэндуму будуць прызнаныя міжнароднай супольнасцю.

Апазіцыя ў дачыненні да рэферэндуму застаецца падзеленай гэтак жа, як і ў дачыненні да выбараў у Палату Прадстаўнікоў. Адна частка агітуе за актыўны ўдзел у выбарах і рэферэндуме, спадзеючыся, што беларускі выбаршчык скажа апазіцыйным кандыдатам „так", а мажлівасці трэцяга тэрміну прызідэнцтва — „не". З'явіліся і звышабсурдныя меркаванні, што рэферэндум гэта мажлівасць перамагчы Лукашэнку ўжо зараз. Другая частка апазіцыі ад пачатку лічыла выбары ў сённяшніх умовах незаконнымі і бесперспектыўнымі. Заклікала да байкоту. Цяпер гэтыя заклікі ўзмацніліся. Зянон Пазьняк заявіў, што гісторыя яшчэ не ведае такога выпадку, каб дыктатар прайграў рэферэндум. Ён усклаў адказнасць не толькі на ўладу, але і на тую частку апазіцыі, якая гэтую ўладу легітымізуе сваім удзелам у выбарах і рэферэндуме.

Улада ў гэты час працягвае дэманстраваць сваю сілу і ўпэўненасць. І перад апазіцыяй, і парад усім светам. Аляксандр Лукашэнка павіншаваў лідэра Карэйскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікі Кім Чэн Іра, якога ў свеце лічаць дыктатарам № 1, з днём утварэння КН-ДР. Сустракаецца з прэзідэнтам Ірана. Апызіцыйныя акцыі разганяюцца. Актывісты арыштоўваюцца. Прычым усё паводле існуючага заканадаўства.

Вельмі важным ёсць і той момант, што ні Лукашэнка, ні яго атачэнне, ні Крэмль, не знайшлі сярод дзесяцімільённага беларускага народа адэкватную замену сённяшняму кіраўніку беларускай дзяржавы. Гэта значыць, што на Беларусі больш няма палітыка, які ў такой ступені як сёння праводзіў бы прарасійскія інтарэсы. А цяперашні кіраўнік гатовы іх праводзіць толькі да пэўных межаў. На поўную здачу суверэнітэту ён не пагаджаецца. Так склалася рэчаіснасць, што нішто не можа зараз перашкодзіць развіццю беларускай незалежнасці. З таталітарным кіраўніцтвам, ці з дэмакратычным, пабудова беларускай дзяржаўнасці будзе працягвацца. Гэта ўжо рэальнасць. А чым закончыцца эпапея бестэрміновага кіравання аднаго чалавека залежыць зараз толькі ад беларускага грамадства.

Віктар Сазонаў

Да Беларусі праз Прагу

Цягнік з Варшавы ў Прагу адпраўляецца на вечар. Пасажыры — іх няшмат — займаюць месцы ў спальных вагонах. У вокнах засоўваюцца фіранкі, людзі распранаюцца, лягаюць спаць. Трыццаць хвілін да мэты падарожжа кандуктар асцярожна пастукае ў дзверы, разбудзіць. Вядома, раней, у Зэбжыдовіцах пастукаюць у дзверы і пагранічнікі — польскія або чэшскія. Ды якая там граніца? Зазірнуць у пашпарт і гэта ўсё. Багаж? Нікому нецікава змесціва тваёй торбы, ды ўвогуле — ёсць у цябе нейкія клункі? Ніхто не пытае. Ты — грамадзянін еўрапейскай супольнасці.

Асацыяцыі з Кузніцай-Беластоцкай прыходзяць міжвольна. Пагранічнікі, мытнікі, славутая таможня, дзе распранаюць да костачкі кожную торбу. Польскія службы сочаць за папяросамі і моцнымі напоямі, беларускія — ніхто ніколі не здагадаецца за чым. Нармальна. У гэтым месцы канчаецца аб'яднаная Еўропа.

У Празе аб'яднаная Еўропа кандэнсуецца ля ўвахода на Карлаў мост натоўпам турыстаў. Англійская мова перагукваецца з нямецкай, італьянская з французскай. Дзяржаўная, чэшская, амаль поўнасцю адсутная. Можна падумаць — бы беларуская ў сталічным Мінску. Але гэта дрэннае параўнанне.

Сувязі паміж беларускім і чэшскім народамі грунтуюцца на стагодніх традыцыях. Гэта ж у Празе, пачынаючы з 1517 года, друкаваў Псалтыр і 22 кнігі Бібліі Францыск Скарына, з 1923 па 1943 год працавала тут Рада Беларускай Народнай Рэспублікі і яе эміграцыйныя прэзідэнты Васіль Захарка і Пётр Крэчэўскі, ды і ў наш час, толькі за апошняе дзесяцігоддзе, палітычны прытулак у Чэхіі знайшлі каля 700 беларусаў.

Ёсць яшчэ адна прастора чэшска-беларускіх кантактаў, якая шчыльна звязвае далёкую мінуўшчыну і сучаснасць. Ужо ў XIV стагоддзі моладзь з Вялікага княства Літоўскага прыязджала сюды за адукацыяй. Апекавалася беларускімі студэнтамі Літоўская калегія, што існавала пры Бетлемскай Капліцы. У дваццатыя і трыццатыя гады мінулага стагоддзя вучыліся ў Чэхіі сотні студэнтаў, перш за ўсё з Заходняй Беларусі. Маладыя беларусы прыязджаюць за адукацыяй у Прагу таксама і зараз, у першыя гады XXI стагоддзя. Студэнтам, выключаным з навучальных устаноў за апазіцыйную дзейнасць, штогод выдзяляецца для бясплатнай адукацыі дзесяць месцаў у чэшскіх універсітэтах.

У 1996 годзе ўзнікла ў Празе Беларуская культурна-асветная суполка „Скарына" як чэшская філія Згуртавання беларусаў свету „Бацькаўшчына".

Дзейнасць суполкі кіруецца на папулярызацыю Беларусі і беларускай незалежніцкай справы сярод чэшскага грамадства, а таксама на падтрыманне нацыянальна-культурнага жыцця самой беларускай грамады.

Па ініцыятыве суполкі „Скарына" 28-29 жніўня 2004 года ў сталіцы Чэхіі адбыўся першы з'езд беларусаў Еўропы (зварот удзельнікаў з'езда на 10 стар.). Прыехалі ў Прагу прадстаўнікі беларусаў з трынаццаці еўрапейскіх краін.

З'езд — водгук на новую сітуацыю, што стварылася з пашырэннем Еўрапейскага Саюза. Працэс аб'яднання затрымаўся на польска-беларускай граніцы, але ў межах Еўрасаюза, па розных меркаваннях апынуліся ад 300 да 700 тысяч нацыянальных беларусаў. Гэта эміграцыя (яна ўсё яшчэ папаўняецца новымі ўцекачамі) і таксама беларусы Беласточчыны ды Віленшчыны, якія жывуць на сваёй зямлі, а далучыліся да еўрапейскай супольнасці дзякуючы польскаму або літоўскаму пашпарту.

У рэзультаце пражскай сустрэчы быў створаны Дэмакратычны форум беларусаў Еўропы. Яго мэта — аб'яднанне і праца для замацавання беларускай прысутнасці па цэлай Еўропе, але таксама падтрымка Бацькаўшчыне, дапамога Беларусі ў вяртанні туды, дзе яе гістарычнае месца. У Еўропу.

Міхась Андрасюк

Вачыма еўрапейца

Замест шаблі

Не магу стрымацца і не напісаць аб скандале, які выклікаў у галерэі „Арсенал" падляшскі дэпутат ад Лігі польскіх сем'яў (LPR) Анджэй Фэдаровіч пры ўдзеле сваіх партыйных калег — сенатара Яна Шафранца і старшыні беластоцкай гарадской рады Эдварда Лучыцкага. Тым, хто не мае ўяўлення аб справе, патлумачу, што дэпутат Фэдаровіч з заядласцю пакрэсліў самапіскай надпісы на карціне студэнта Акадэміі мастацтваў у Познані Радаслава Шлягі, якая прэзентавалася ў вядомай ва ўсёй краіне беластоцкай выставачнай зале. Не шкадаваў ён прытым саміх прац. Да гэтай атакі паспеў „заказаць" здымачную групу Тэлебачання Беласток, якая — без ніякага сораму і, пасля, каментарыяў дала справаздачу з гэтага хуліганскага інцыдэнту.

— Усю выстаўку я магу ацаніць як выдумку мастака, які раніцай устаў з пахмеллем ад гарэлкі ці наркотыкаў, пакаўзнуўся ў ваннай і грымнуў галавою, — гаварыў дэпутат на адмыслова скліканай прэс-канферэнцыі. — Гэтая галерэя рэалізуе нейкія вычварэнствы за грошы падаткаплацельшчыкаў.

Галоўнай мішэнню атакі была карціна, на якой было надпісана: Wszechpolus, censorus, bestia, nie głaskać. Над гэтым: owczarek Dozor і сабачая будка. Гэтая інсталяцыя выразна навязвала да леташняй асенняй выставы ў „Арсенале" „Сабака ў польскім мастацтве". Выклікала была яна пратэсты беластоцкіх радных ад LPR, перш за ўсё Беаты Антыпюк. Дэпутат Фэдаровіч абяцаў Моніцы Шэўчык дырэктар „Арсенала": Ja panią załatwię.

Не будзем тут гаварыць аб гэтым матыве персанальнай помсты. На маю думку, дзеянні дэпутата Фэдаровіча ў першую чаргу маюць усе прызнакі злачынства. Зруйнаваў ёй чужую ўласнасць, да таго карыстаючыся тэлекамерамі на вачах тысяч гледачоў. Для мяне гэта не толькі адзін з цэнзарскіх ухілаў, праява цемрашальства. Гэта спроба вызначэння грамадству дэструктыўнага спосабу дзеяння ды метаду агрэсіўных паводзін і выказвання адносін да свету, не толькі да мастацтва. А што ў гэтым найгоршае, дык тое, што гэта робіць дэпутат РП пры адабрэнні іншага парламентарыя ды гарадской самаўрадавай улады. Да таго даходзіць яшчэ хлусня. Хоць бы такая, як пару дзён пасля падзеі, дзе на наступнай прэс-канферэнцыі тройца гэтых паноў прабавала даказаць, што дэпутат Фэдаровіч не ведаў, што ў яго ўключаная самапіска і хацеў яе прымяніць як указку. На канец паны з LPR адвярнулі, так сказаць, „сабаку хвастом".

— Гэта выстаўка — помста над LPR, з выкарыстаннем правакацыі, — гэтак выказаўся сенатар Шафранец.

Пытанне: хто каго хоча тут załatwić?

На шчасце, Раённая пракуратура ў Беластоку не ўкленчыла перад спакушаннямі парламентарнымі імунітэтамі і ілжывым, прымітыўным балбатаннем. Рашыла пачаць у гэтай справе судовы працэс. Неабыякавая (абураная) таксама часць пастаронніх назіральнікаў. Большасць чытачоў беластоцкіх газет каментавала гэты скандал падобна як тыя, чые выказванні паказаліся ў „Газеце ў Беластоку":

— Пан Фэдаровіч, паслугоўваючыся самапіскай, знізіўся да ўзроўня асобеняў крэмзаючых у срачах.

— За гэткі вандалізм паліцыя павінна пасадзіць яго за краты, так як малалетак, што ноччу брыдка папісалі свой ліцэй, бо ён ім не падабаецца, як дэпутату — выстава.

Калі толькі пракуратура накіруе справу ў суд, дык вельмі цікава будзе, як акрэсліць шкоднасць учынку. Да таго цікава, як адносіцца да гэтага краёвая камісія дэпутацкай этыкі, у якую мае падаць заяву Унія працы дзеля пакарання дэпутата-вандала.

Мацей Халадоўскі

За апошнія гады ў Беларусі паўсталі цэлыя брыгады прафесійных „дажыншчыкаў". Не трэба ехаць у Расію на сезонныя працы, можна добра падзарабіць і на айчыне. Плацяць будаўнікам штодзённыя тысячу дзвесце так званых „кватэрных" плюс тры тысячы на абед. Сам заробак па беларускіх мерках даволі вялікі — семсот-васемсот тысяч (каля 325-370 долараў), а то і болей...

Дажынкі і „карцінкі"

У гэтым годзе цэнтральныя дажынкі з удзелам найвышэйшых улад Беларусі адбудуцца 17 і 18 верасня ў памежным з намі Ваўкавыску. Культурная праграма прадугледжвае ўдзел 90 калектываў, якія выступяць на сямі сцэнах. На правядзенне самых культурных мерапрыемстваў выдзелена 360 млн. рублёў (170 тыс. долараў). Прапануем рэпартаж з Ваўкавыска напярэдадні дажынак (рэд.).

Такога забурэння Ваўкавыск не ведаў хіба з часу Тэўтонскага ордэна, калі вялікі магістр Ульрых фон Юнгінген у 1410 г. захапіў горад і спаліў яго. Разбудова алімпійскіх Афінаў — нішто перад ваўкавыскай дажынкавай рэканструкцыяй. Калі нехта возьмецца даводзіць, што беларусы — хрысціянскі народ, хай паедзе ў Ваўкавыск. Дажынкі — неўміручае свята вострага сярпа і залацістага снапа — вось галоўная падзея года для нацыі.

— Чарговыя дажынкі планавалася праводзіць у Лідзе, аднак летась група аматараў мясцовай гісторыі склала да мясцовай улады адпаведны зварот наконт юбілею Ваўкавыска, зладзіла сур'ёзную навуковую канферэнцыю, — каментуе Мікалай Аксаміт, колішні дэпутат Вярхоўнага Савета Беларусі. — На яе ад улады прыйшоў толькі адзін чалавек — супрацоўнік ідэалагічнага аддзела. Менавіта з юбілейнай даты тысячагоддзя Ваўкавыска паўстала ідэя правесці дажынкі ў нашым горадзе. Мясцовая ўлада за яе ўхапілася, але яна нават прыблізна не ўяўляла маштабу працаў. У Ваўкавыску гадоў дваццаць, а то і больш нічога не рамантавалася, за дзесяць апошніх — была заасфальтаваная толькі адна вуліца. Калі цэнтр раскапалі, „вылезлі" інжынерныя камунікацыі ў вельмі запушчаным, аварыйным стане. Горад, безумоўна, ад дажынак выйграе, але каб такую рэканструкцыю рабілі гады тры, то і якаснасць прац была б вышэйшая, ды і абышліся б яны значна танней.

Раскапаны цэнтр

Горад зараз нібы пасля вайны, а колькасць будаўнічай тэхнікі перавышае завочнае ўяўленне. Гістарычны цэнтр увесь раскапаны (на маю думку, археолагі мусілі біць у званы!). Горад сёння страціў спакой і звыклы лад жыцця, але затое ў бліжэйшай перспектыве істотна папрыгажэе. Зараз жа з'явіліся новыя працоўныя месцы — каля 20% жыхароў Ваўкавыска ўладкаваныя. Добрая мажлівасць падзарабіць у маладых, бо аб'ёмы асвойваемых работ значныя.

Адчуванне, што ўплыў мясцовай улады на працэс нязначны. Па словах многіх, агульнай спланаванасці няма. Пануе нейкая дыфузійная стыхійнасць — нібы людзі спусціліся на верталётах і робяць кожны сваю частку паасобку. Можна праехаць легкавіком, а праз пяць хвілін дарога ўжо будзе перакапана. Не дайсці, не даехаць! Хапае і праектных

Мадэрнізуецца гатэль „Бярозка", да гэтага хіба сама няўтульны і недагледжаны ў вобласці

недарэчнасцей. Так на кальцавой дарозе абапал горада ўклалі добрыя, але непатрэбныя ходнікі, а сама дарога звузілася, так што ўзімку на ёй будзе даволі небяспечна ездзіць.

Зашмат паказухі

— Зашмат ва ўсім гэтым паказухі, — кажа маладая бухгалтарка А. — Фасады дамоў робяць прыгожымі, з новымі вокнамі-шклопакетамі, а з боку двароў ранейшая занядбанасць. Некаторыя будынкі паразбіралі, але прыдатныя матэрыялы жыхарам не аддалі, а закапалі (!!!) у зямлю.

Усё робіцца пад аднаго чалавека. Абы дагадзіць Бацьку, улагодзіць, не выклікаць „праведны" гнеў. А то возьме ды нашле які-небудзь землятрус ці мор.

Будаўнікі жывуць па розных інтэрнатах і нават па навакольных вёсках і зачыненых школах, бо жытла на такую велізарную колькасць часовых працаўнікоў элементарна бракуе. За апошнія гады ў Беларусі паўсталі цэлыя брыгады прафесійных „дажыншчыкаў". Не трэба ехаць у Расію на сезонныя працы, можна добра падзарабіць і на айчыне. Плацяць будаўнікам штодзённыя тысячу дзвесце так званых „кватэрных" плюс тры тысячы на абед. Сам заробак па беларускіх мерках даволі вялікі — семсот-васемсот тысяч (каля 325-370 долараў), а то і болей. У вольны час бальшыня заезжага люду бязбожна п'е. „Злыя" языкі кажуць, што ў крамах знікла нават танная парфума.

Ваўкавыск — Аляксандраўская вуліца, канец XIX ст.

„Няўпіска" ў агульны праект

— Усе мясцовыя бізнесоўцы змушаныя былі мяняць дахі, фасады сваіх дамкоў, нягледзячы на папярэднія капіталаўкладанні на рамонт, якія ўсе зацвярджаліся, — абураецца прадпрымальнік М. — А цяпер іх выгляд „не ўпісаўся" ў агульны праект. Тое ж і з дзяржаўнымі „ўладаннямі". Летась паклалі дастаткова добрую плітку ля банку, а цяпер яе ўсю пазрывалі. Прытым вуліцы, нават крыху аддаленыя ад цэнтра, ніхто не кранае. Нават ямы ніхто хіба і не збіраецца засыпаць.

Цэнтральны пляц цалкам перароблены наноў. На ім зрэзаныя ўсе кусты і дрэвы (відаць для таго, каб агляд у ахоўнікаў саноўных целаў быў як мага шырэйшы). Знік і стары фантан, які лічыўся пэўным сімвалам горада (апошнім часам яго „запускалі" толькі ў рэдкія святы). Праўда, за палацам зроблены даволі файны скверык. Велізарная ж галоўная плошча выкладзена дробнай пліткай. Толькі Ільіч пасміхаецца. Цяпер Ваўкавыск займеў адзін з сама вялікіх пляцоў ва ўсёй Еўропе.

Еўрарамонт

Будынак райвыканкама летась перацярпеў капітальны рамонт. Але зараз з'явілася мажлівасць зрабіць еўрарамонт, чым мясцовыя „вертыкальнікі" і скарысталіся. У такой спрыяльнай сітуацыі кожны імкнецца ўхапіць паболей. На вачах мадэрнізуецца гатэль „Бярозка", да гэтага хіба сама няўтульны і недагледжаны ў вобласці. Напэўна будзе завершана будаўніцтва новага праваслаўнага сабора. Рэстаўруецца і старая вуліца Жолудзева, што вядзе да вакзалаў.

Праект рэканструкцыі рэчкі Ваўкавыі быў складзены яшчэ дваццаць год таму, але толькі зараз да яе дайшлі рукі. Знесены многія старыя хаты, на іх месцы ўсяго за тры месяцы вырас новы сучасны дом з усімі выгодамі. Платы ў прыватным сектары ставяцца пакуль бясплатна, але, напэўна, потым з людзей будуць вылічваць грошы. Безумоўна, прыбытак маюць цяпер харчовыя ўстановы, тым больш, што Ваўкавыск славіцца сваімі якаснымі смачнымі мяснымі і малочнымі вырабамі.

Да юбілею Ваўкавыска складаўся цэлы шэраг прапаноў — паставіць два гістарычныя помнікі, выпусціць адпаведныя паштоўкі, маркі, канверт, альбом. Але за дажынкамі пра гэта ўсё напэўна забудзецца.

А пакуль праца кіпіць і кпіць з яе больш не будзем. Тым больш, што Ваўкавыску сапраўды пашанцавала. Можна толькі прагназаваць з якога месца Беларусі ў наступным годзе будуць ляпіць „горад сонца".

Уладзімір Хільмановіч

Герб — на блакітным полі выява галавы ваўка.

Горад упершыню ўпамінаецца ў Іпацьеўскім летапісе пад 1252 годам. У 1503 годзе атрымаў магдэбургскае права і герб. У час напалеонаўскіх войнаў амаль поўнасцю спалены. Пры канцы XIX стагоддзя горад налічваў 10 тысяч чалавек. З той пары важная чыгуначная станцыя на лініях Баранавічы — Беласток і Ліда — Седльцы. У міжваеннай Польшчы — павятовы цэнтр Беластоцкага ваяводства. Зараз раённы горад Гродзенскай вобласці з 42-тысячным насельніцтвам.

Ацэнка фэсту

Па запрашэнні солтыса Бандароў Ніны Лукшы, а таксама актыўнага дзеяча Рамана Ляткоўскага — гаспадара клуба „Карына-2000” у Новай Луцэ абдылася сустрэча арганізатараў ліпеньскага беларускага фэсту ў Бандарах. У спатканні прынялі ўдзел войт Міхалоўскай гміны Марк Назарка, старшыня ГП БГКТ Ян Сычэўскі, сакратар ГП БГКТ Валянціна Ласкевіч, а таксама мясцовыя дзеячы. Удзельнікі спаткання высока ацанілі падрыхтоўку і правядзенне фэсту і адзначылі вялікае запатрабаванне насельніцтва на мерапрыемствы, якія прапагандуюць беларускія песні і танцы.

Войт Міхалоўскай гміны абяцаў фінансавую падтрымку бандарскаму фэсту ў будучым. Старшыня ГП БГКТ запэўніў, што апошняя нядзеля месяца ліпеня кожнага года будзе адведзена гэтаму фэсту. Сакратар ГП БГКТ заявіла, што ў 2005 годзе, у сувязі з 5-годдзем святкаванняў у Бандарах, прыдбае самыя лепшыя калектывы, у тым ліку і з Беларусі.

Госці адзначылі, што мясцовы актыў заслугоўвае на вялікую падзяку. Мясцовае насельніцтва сур’ёзна ставіцца да беларускіх мерапрыемстваў. Сабраныя шчыра падзякавалі ўладам за высокую ацэнку.

Віктар Бура

Выстаўкі

„Белавежскія інспірацыі — Год зубра 2004” — так назвалі пасляпленэрную выставу жывапісу, якую адкрылі 22 жніўня г.г. у Прыродазнаўча-лясным музеі Белавежскага нацыянальнага парку ў Белавежы (Палацавы парк). Экспазіцыя складаецца з карцін, якія намалявалі шаснаццаць мастакоў з Нямеччыны і Польшчы.

Выставу карцін лепшых айчынных і замежных мастакоў можна глядзець кожны дзень ад 9 да 16^{30} гадз. Будзе яна працаваць да 3 кастрычніка 2004 года.

* * *

25 верасня ў 15 гадзін Гайнаўскі дом культуры па вул. Беластоцкай 2 запрашае на адкрыццё мастацкай выставы Дануты Кот.

(мох)

Канцэрт

Пры сонечным і цёплым надвор’і ў першую нядзелю верасня г.г. у амфітэатры ў Нараўцы (Гайнаўскі павет) паспяхова прайшоў канцэрт двух мастацкіх калектываў з Беларусі, у тым ліку віртуознага аркестра народных інструментаў са Свіслачы.

Жыхары Нараўкі і навакольных вёсак паўтары гадзіны слухалі самыя папулярныя беларускія і рускія песні. Галоўным пунктам праграмы было выступленне салістаў Галіны Мацішук і Аляксандра Паўлючэнкі. Хутка прайшоў час канцэрта сабраным у тую нядзелю гледачам. Больш бы такіх культурна-забаўляльных мерапрыемстваў.

(мох)

Стаўка на малако

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Раман Савіцкі першым у Мілейчычах купіў умяшчальнік для малака

У Мілейчычах пераважаюць малаўраджайныя землі. Гаспадары ўжо ў мінулым пераўтваралі палі на сенажаці і займаліся жывёлагадоўляй. Пачаткова не было вялікіх статкаў кароў.

— „Ставім на кароў” — гэта лозунг маладых гаспадароў з Мілейчыцкай гміны, якія рашыліся заняцца прадукцыяй малака, — кажа Раман Савіцкі з Мілейчыч. Сустракаю яго побач гумна, якое прыстасоўваецца на абору. Малады гаспадар сутыкнуўся з жывёлагадоўляй у Германіі. Працаваў там у фермера і прыглядаўся як немцы пабольшваюць прадукцыю малака. Прыехаўшы дамоў, рашыўся разбудаваць бацькаўскую гаспадарку (14 гектараў) і заняцца адной спецыяльнасцю — жывёлагадоўляй. З яго ўзялі прыклад некалькі маладых гаспадароў з Мілейчыч.

Раман Савіцкі гаспадарыць на 58 гектарах зямлі. Гадуе 42 штукі быдла, у тым ліку 18 кароў. Намерваецца павялічыць статак да 32 кароў.

Яго панадворак на выгляд не адрозніваецца ад традыцыйных вясковых гаспадарак. Побач драўлянага хлява, упоперак панадворка, знаходзіцца вялікае гумно. Перад гаражом брукаваная дарога. Далей расце трава. Будынкі перабудоўваюцца ўсярэдзіне. Побач памяшкання з умяшчальнікам для малака, што знаходзіцца ў гаражы, ёсць даільны ўчастак. Гумно толькі часткова перабраблена на абору. Хлеў з цялятамі яшчэ чакае мадэрнізацыя.

— Я першы ў Мілейчычах атрымаў санітарна-ветэрынарны атэстат на прадукцыю малака, згодна з еўрасаюзнымі патрабаваннямі. Хацелася б паставіць новую абору, але няма сродкаў на рэалізацыю такой задумы. Ад немцаў я ўзяў ідэю прыстасоўваць старыя будынкі да патрэб сучаснай жывёлагадоўлі. Абору будую з гаража і гумна. Польшча яшчэ не выкарыстала прызначаных ёй лімітаў прадукцыі малака. Жывёлаводы могуць выступаць за павелічэнне прызначаных ім раней квотаў прадукцыі і таму ёсць шанц, каб разбудоўваць гаспадаркі, — гаворыць Раман Савіцкі. На інвестыцыі ўзяў ён крэдыт пад 1,4% для маладых гаспадароў з Агенцтва рэструктурызацыі і мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі. Танны крэдыт даў таксама Малочны кааператыў з Гайнаўкі, які ў яго купляе малако.

— Не звяртаўся я за структурнымі сродкамі з еўрасаюзных фондаў, бо было мала часу на афармленне спраў. Аднак хачу выступіць за такой дапамогай на дафінансаванне інвестыцыі. Рашыўся я на Гайнаўскі малочны кааператыў, бо выдаткоўвае ён сродкі на інвестыцыі і прыстасоўваецца да еўрасаюзных патрабаванняў. У справах цэн кансультуецца з сялянамі, — тлумачыць гаспадар. Гайнаўскі кааператыў плаціць яму па 1,6-1,8 зл. за літр малака. Гэтая цана вышэйшая за сярэднюю. Залежыць яна ад колькасці бялку ў малацэ, класа — экстра, які можна атрымаць за чысты прадукт, ветэрынарна-санітарнага атэстата і свайго ўмяшчальніка, у якім малако ахалоджваецца да тэмпературы 5°С.

— Гэта мінімальная цана за малако, пры якой можна яшчэ думаць аб інвестыцыях. Я планую разгарнуць гадоўлю кароў, але яе прыбытковасць будзе залежаць ад палітыкі Бруселя. Мне зручней было б, каб даплаты да сельскагаспадарчай прадукцыі залежалі ад велічыні прадукцыі. Зараз частку даплатаў возьмуць уласнікі зямлі, якую я арандую. Вялікай перашкодай для гаспадароў з’яўляецца нестабільная палітыка ў галіне сельскай гаспадаркі і адсутнасць празрыстых законаў у Польшчы. Цяпер цяжка прадбачыць, што будзе праз некалькі гадоў, — кажа Раман Савіцкі. — Я ўжо рашыўся механізаваць жывёлагадоўлю і павялічыць прадукцыю малака. Летам кароў і старэйшых цялят планую трымаць на сенажаці, а малодшых цялят — у аборы. Каб каровы давалі больш малака, купляў я яловак, якія прынамсі ў 90% гальштэйнска-фрызскай пароды і пакідаю ад гэтых кароў цялят. Каровы такой пароды, пасля адлучэння цялят, даюць у мяне па 35-40 літраў малака ў дзень. У сярэднім мае каровы даюць па 5 300 літраў малака ў год.

У Рамана Савіцкага мала ўраджайнай зямлі і таму пераважна сее ён авёс, жыта і ячмень. На лепшых землях вырошчвае пшаніцу і кукурузу. Збожжа ў 70% выкарыстоўвае ён на корм для быдла, а апошняе прадае. Аднак асноўным кормам для кароў зімой з’яўляецца сілас. Папаўняюць яго мяшанкі са збожжа і сена.

— Калі я першы ў Мілейчычах пачаў сеяць кукурузу, то суседзі смяяліся з майго рашэння. Аднак кукуруза — самы лепшы корм для быдла. Не замесціць яе ні збожжа, ні сілас, — гаворыць гаспадар.

У Германіі жывёлаводы карыстаюцца мяшанкамі са збожжа і кукурузы, кормам з вялікай колькасцю бялку і іншых кампанентаў патрэбных для інтэнсіўнай прадукцыі малака. Яны даюць большую колькасць малака, але адначасна робяць яго менш смачным і менш здаровым.

Аляксей Мароз

Маніпуляцыя

Цікава, чаму Юрый Гаўрылюк — галоўны рэдактар „Над Бугом і Нарвою, у сваім часопісе н-р 2 (2004) даў такі зманіпуляваны загаловак для свайго крывадушнага артыкула „Buło, cool!” albo Dlaczego okłamano Ewelinę P.?” Калі „okłamano Ewelinę P.”, то чаму пра сябе Эвеліна Пліс, жыхарка Шастакова, што на Гайнаўшчыне, кажа: „Uważam się za Białorusinkę. Lubię (вылучэнне маё — М.К.) czytać po białorusku, bo to mój język ojczysty”. А хто прычыніўся да гэтага? — пытае журналіст. Эвеліна Пліс: „Moja rodzina, w której mówimy dialektem białoruskim, ojczysta wieś Szostakowo, gdzie także często rozmawiam z przyjaciółmi po swojemu”. На думку Гаўрылюка, zarówno w Szostakowie, jak i w Czyżach używana jest gwara ukraińska, więc nie sądzę, aby rodzina Plisów była jakimś białoruskojęzycznym (czy używając miejscowej terminologii ludowej — litowśkim) wyjątkiem”.

У тым то і справа, што наша мова з’яўляецца не „jakimś białoruskojęzycznym wyjątkiem”, толькі старабеларускай гаворкай. І не толькі я так „sądzę”. Ці ж Жыгімонт Стары ў 1509 годзе да сваіх падначаленых звяртаецца на ўкраінскай гаворцы, кажучы: „многі людзі, Русь, в тых местах нэзаконнэ мешкають, жоны поймаючі нэ веньчаются, а дэтэй крэстіті нэ хотят”? А няхай Гаўрылюк пачытае I, II або III Статуты Вялікага княства Літоўскага. На якой мове яны напісаны?

Пэўна, можна махнуць рукой на такія фальшывыя публікацыі перафарбаваных беларусаў, якія пастанавілі быць украінцамі. Але, калі так падумаеш, чаму гэткая публікацыя мае служыць? Па-мойму, гэта мае ўводзіць між нашымі нацыямі канфлікт. Бо калі будзем, мы, „mniejszości narodowe”, грызціся між сабою, то тым лепш для большасці. Цікава, што на гэтую тэму думаюць украінцы, але не перафарбаваныя беларусы, толькі фактычна этнічныя.

Напісаў я на пачатку, што публікацыя Гаўрылюка крывадушная. Фактычна, так ёсць, доказам чаго з’яўляюцца цытаты з навуковай працы Я. Мірановіча на тэму ўвядзення беларускага школьніцтва ў Беластоцкім ваяводстве. Цытаты вырваныя з кантэксту. Аб чым іншым піша Мірановіч, а што іншае маюць абгрунтаваць цытаты, змешчаны ў „«Buło cool!»...”. З разважанняў Ю. Гаўрылюка ў яго артыкуле вынікае, што беларускасць над Бугам і Нарваю ўвяла камуністычная ўлада. От, такі данос для сённяшняй улады ў Польшчы: няма чым пераймацца, беларускасць не абгрунтаваная. Заўсёды тут была Украіна, толькі камуністы пасля вайны, на сілу ўвялі, насамперш, беларускае школьніцтва, потым гурткі БГКТ на вёсках і т.д., але людзі беларускасці не хочуць. Адкуль затое Гаўрылюк ведае, што хочуць быць украінцамі? У сваім артыкуле аб гэтым не піша, толькі пляце кашалі, што мова падобная на ўкраінскую. А можа наадварот, украінская мова ўзяла свой пачатак ад старабеларускай?

Міхась Куптэль

У палоне казацкіх напеваў

фота http://www.sptimes.ru

Пра існаванне мястэчка Бурштын мы даведаліся на вакзале ў Львове.

— Файны назоў, — падумалі згодна мы з Домнай.

— Найпрыгажэйшы з усіх, што па дарозе ў Івана-Франкоўск.

— Ну дык што?

— Паехалі.

Праз тры гадзіны мы былі на месцы. У цэнтры Бурштына, дзе спынілася наша маршрутка, грымела казацкае *disco polo*.

Зразу зачапіў нас таксіст, які самотна выстойваў на прыпынку:

— А вы, *дівчынята*, да каго прыехалі? — спытаў проста з моста.

Нам падабалася адкрытасць і ўвага, якой пачаставалі тут на прывітанне. Асабліва калі пачулі, што ў гарадку прыстойная і танная гасцініца.

— Толькі глядзіце, каб вас не ўкралі! — упамянуў нас таксіст.

* * *

У гасцініцы „Галічынка" нас пасялілі ў пакоі н-р 13.

— Ach, Polacy do nas przyjechali! — прывітала нас стройная вахцёрка з манерамі дамы. — Proszę mówić po polsku! — зажадала. — Wszystko ja rozumiem. W Warszawie pięć lat przemieszkała.

На пытанне, чым займалася ў нашай сталіцы, вахцёрка павярнула ката хвастом.

— А вы ў наш Крым збіраецеся?

Мы спыталі пра мясцовыя атракцыёны.

— Можа, ведаеце такую Руслану з тэлебачання?

— Вядома — усе ведаюць вашу Руслану.

— Яна з нашых аколіц, — адзначае з гонарам дама. — А ведаеце, чаму яна перамагла ў конкурсе Еўрабачання?

— Бо прыгожа і добра спявала... — пачалі мы.

Нашы меркаванні дама пракаментавала іранічнай усмешкай.

Аказваецца, на сёлетні міжнародны поспех Русланы запрацавала гісторыя.

У пачатку шаснаццатага стагоддзя жыла ў недалёкім Рагатыне прыгажуня Насця Лісіцкая. Як адзначаюць крыніцы, была яна дачкой свяшчэнніка Свята-Мікалаеўскага прыхода. У 1520 годзе іх горад спляжылі татары. Дзяўчыну захапілі ў палон. Пасля сустракаем яе ў Канстанцінопалі, у гарэме султана Сулеймана (Цудоўнага). Там атрымлівае яна імя Раксаляна (на турэцкай мове — русінка). Паводле легенд, Раксаляна заваявала выключнасць і стала адзінай каханкай Сулеймана. Мела вялікі ўплыў на турэцкую палітыку. І зараз галоўны рынак у Рагатыне названы яе імем.

— То ўжо ведаеце, — падміргнула нам вахцёрка, — чаму нашыя выправілі Руслану ў Турцыю?!

* * *

Каб ахалануць перад ноччу, мы пакінулі свой пакойчык (за чатыры долары) і рушылі прагуляцца па горадзе. У кафэ-бары „Вадалей" таўпіўся падвыпіўшы табун падлеткаў. Грымела казацкае *disco-polo*. Такая ж музыка лунала і ў гарадскім парку. І ў рэстаране, дзе спраўлялі вяселлі.

Мы ішлі галоўнай вуліцай Бурштына ў напрамку Рагатыня. У мястэчку новая царква, некалькі мяшчанскіх дамоў з пачатку мінулага стагоддзя, блёкі, многа злосных сабак і электрастанцыя. Ёсць штучнае возера і парк адпачынку.

У кафэ-бары „Людміла", стылізаваным на сярэдневяковы замак, выседжвалі самотныя афіцыянты. Мы рашылі тут павячэраць. На пачатку расселіся за драўлянымі лавамі і гучна сталі захвальваць інтэр'ер і прыступныя цэны. За смачны боршч і яшчэ больш смачную рыбу мы заплацілі па два долары.

Ды гэта не канец атракцыёнаў.

Калі прыадчыніліся дзверы з суседняй залы, да нас даляцелі мужчынскія хвацкія спевы і свісты, якія час ад часу падмацоўвалі стрэлы (здаецца, стралялі коркі ад шампанскага!).

Стрэлы і свісты мяшаліся з прыпевам: *Гэй-гэй! Уха-ха!*

* * *

Усяму вінавата ўкраінская песня! Яна тут усюды, куды не ступіш. У магазінах, у аўтобусах, на базарах, на вакзалах. Самы папулярны від — украінскае *disco-polo* — народная песня ў спалучэнні з рытмічна-схематычнай, просценькай мелодыяй. За ўсе дні на Украіне мы моцна прасяклі яе рытмам. І зараз, калі ўрэшце пачулі сапраўдныя, народныя ўкраінскія песні, па сэрцы пацёк мёдзік.

Ды за прылаўкам у бары думалі... як у Беластоку. Значыць, калі ў суседняй зале мацнеў спеў, у нашай — усё гучней бубніла ўкраінская папса. У канцы мы папрасілі:

— Там так цудоўна спяваюць — дайце паслухаць!

Праз некалькі хвілін мы ўжо знаёміліся з суседзямі-спевакамі. Праўда аказалася мацнейшай за нашы ўяўленні (спачатку мы чамусьці палічылі іх народным калектывам, святкуючым свой юбілей).

— А мы — бізнесмены, — кажа Багдан С. — З самога Кіева.

Пасля мы даведаліся, што ўсе нашы бізнесмены гандлююць з Турцыяй. Чамусьці прыгадалася гістарычная Раксаляна і як у дарозе палохалі нас мафіяй...

Калі прагучала песня „Ехалі казакі" (пра няшчасную Галю, што яе ўкралі і спалілі, раней прывязаўшы косамі да сасны!), мы ўстрывожыліся.

— Вы, дівчата, лепш уцякайце! — шапнуў на вуха зеленавокі Багдан С. — Уцякайце, бо ўкрадзем вас!

У сувязі з тым, што мы не збіраліся выступаць за год на Еўрабачанні, разам з усходам сонца мы пакінулі распяваны Бурштын.

Ганна Кандрацюк

III Мядовы фэст у Белавежы

21 жніўня ў Белавежы адбыўся III Мядовы фэст, які арганізаваў Белавежскі аддзел ПТТК. Фэст распачаў ігрою на сігнальнай трубцы Вінцук Няроба з Белавежы. Была гэта музыка: „Прывітанне", „Darz Bóг" і „Мядзведзь". На фэст прыехалі лепшыя пчаляры з Гайнаўкі, Саколкі, Юхнаўца-Касцельнага, Дубіч-Царкоўных і Ломжы. Кожны мог бясплатна паспрабаваць іхняга мёду і прыняць удзел у конкурсе на найлепшы мёд. Удзельнікі фэсту глядзелі выставу мёду, воску, прапалісу (пчалінага клею) ды пасечнага абсталявання, а таксама вопратку пчаляра. Турысты рассмакаваліся ў пітным ды ў сотавым мёдзе.

Арганізатар фэсту паклапаціўся, каб апрача мёду можна было паласавацца гарохавым супам, печанымі каўбаскамі і бульбяной кішкай. Іграў вакальна-інструментальны калектыў з Бэмова каля Варшавы. Пасля 13 гадзіны з дакладам на тэму пушчанскага бортніцтва выступіў Анджэй Кэчынскі, навуковы працаўнік Белавежскага нацыянальнага парку. Лекцыю ўсе выслухалі з вялікім зацікаўленнем. Бортніцтва — адна з цікавінак мінулага. А яшчэ калі пра яго займальна расказвае выкладчык-эрудыт. Борці захаваліся ў Белавежскай пушчы да нашых часоў, між іншым, у запаведніку і на ахоўнай пушчанскай тэрыторыі над рачулкай Гвозьнай.

У конкурсе на найлепшы мёд пераможцам стаў Ян Савіцкі з Белавежы. Узнагароды атрымалі Аляксей Грыцук і Ян Вільчэўскі з Гайнаўкі, Чэслаў Кеда з Саколкі ды Лявон Янушкевіч з Юхнаўца-Касцельнага. Былі гэта прыгожыя насценныя гадзіннікі, дыпломы ды альбомы „Белавежская пушча". Праз год — так заявіла войт Белавежскай гміны Анна Байко — будзе ўстаноўлена спецыяльная ўзнагарода за найлепшы мёд — „Залатая пчала".

На заканчэнне фэсту адбылася дэманстрацыя прыродазнаўчага кінафільма „Symfonia Serengeti" ў канферэнцыйным зале Музея Белавежскага нацыянальнага парку.

Янка Целушэцкі

Ужо гісторыя

З сентыментам успамінаю мінулае: бестурботнае дзяцінства, школьныя гады, прафесійную працу. Асаблівае месца ў маёй біяграфіі займае супрацоўніцтва з „Нівай". З тыднёвікам ставіў першыя крокі на ніве роднага слова. І дружба працягваецца больш сарака гадоў. Праўда, у час духовага крызісу задумоўваўся: „пісаць ці не пісаць далей", але крызіс праходзіў ды нейкая патаемная сіла шаптала: „сябры не падводзяць". І я выходзіў на прыволле. Зараз без сумненняў магу сказаць: так застанецца да маіх апошніх дзён.

Штуршком для гэтага допісу была сустрэча з Міхасём Куптэлем у рэдакцыі ў канцы ліпеня.

— Рашыў кніжачку выдаць, — заявіў калега. — Копіі допісаў раблю. Спонсараў падшукаць трэба. І змяніўшы тэму дадаў: — А ты многа пішаш? Паспрабуй упарадкаваць матэрыялы ды пагавары ў гміне. Можа нейкі грош кінуць... Ідэя спадабалася. Працаўнікі ГОК неаднойчы прасілі мяне, каб даць ім допісы аб Чаромсе, якія друкаваліся ў „Ніве". А колькі такіх было? Зараз цяжка палічыць, паколькі не ўсе захаваліся ў хатнім „архіве". Ад 5 лістапада 1995 года да 22 жніўня г.г. было змешчаных 765 публікацый (скрупулёзна складзены яны ў папяровых папках). А з пачаткаў майго супрацоўніцтва (канец 1950-х гадоў па 1995 г.) не ўсе захаваліся. Налічыў такіх 386. У падліку складае гэта 1151 матэрыял. Найбольш захавалася з сямідзесятых гадоў, калі рэдакцыя арганізавала конкурс „Карэспандэнт года". Намагаўся быць у авангардзе. Заваёўваў вядучае месца. Зараз няма грошай на арганізаванне такіх мерапрыемстваў. А шкада, бо такія сустрэчы падтрымоўваюць „на духу" вясковых карэспандэнтаў. Праўда, была гаворка, што сустрэча карэспандэнтаў адбудзецца пасля Вялікадня ў гэтым годзе, але ўсё сціхла...

Лістаю пажаўцелыя выразкі сваіх допісаў. Казкі для дарослых, фельетоны з рубрыкі „З маёй званіцы" ды кароценькія паметкі ў рубрыцы „Кажуць, што..." адлюстроўваюць мінулую эпоху. Гэта ўжо, можна сказаць, гісторыя. Так яно і ёсць. Найбольш маіх публікацый тычыцца Чаромхі і наваколля. Ды не толькі. Многа было матэрыялаў з Гайнаўшчыны і Бельшчыны з шасцідзесятых гадоў, калі працаваў я ў Ваяводскім праўленні кіно і ездзіў з кінаперасоўкай па вёсках.

Канстатуючы вышэйсказанае, варта ўпарадкаваць гэтую гісторыю ў адну цэласць і перадаць у спадчыне маладому пакаленню.

Уладзімір Сідарук

Няхай пахваляць

Ёсць такія, якія ўмеюць сабою хваліцца, маўляў, яны вельмі разумныя, адукаваныя і найлепшыя на ўсю вёску гаспадары. Пераважна такія людзі падлізваюцца падобным сабе; яны — як павенчаныя пары. Не ведаюць, відаць, што толькі дурань хваліцца сабою. Вартасны той, каго людзі пахваляць.

(мп)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

На ўроку беларускай мовы ў ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім

Тут сімпатычныя вучні

— Наш клас вясёлы! — гучна заяўляюць дзяўчаты і хлопцы з IV „б” класа ў бельскай „тройцы”.

Сустракаемся на ўроку беларускай мовы. Настаўніца Валянціна Бабулевіч адзначае:

— Сапраўды, тут сімпатычныя вучні. Калі разглядаем новую тэму, яны жыва ўсё каментуюць, падкідаюць свае ідэі.

Сёння знаёмімся з „Зоркай”.

— А ці ваша газета выходзіць у Беларусі? — пытаюць дзеці. Многія з іх толькі з гэтага года падпісаліся на „Ніву”.

— „Зорка” друкуецца ў Беластоку. З 1957 года. Яе чыталі вашы бабулі, мамы, дзядзькі і цёці, старэйшыя браты і сёстры. Многія дзеці з „тройкі” дасылаюць нам свае артыкулы, вершыкі, апавяданні, малюнкі. Яшчэ больш удзельнічае ў нашых конкурсах. Асабліва ў конкурсе „Польска-беларуская крыжаванка”.

Усе дзеці з чацвёртага „б” любяць урокі беларускай мовы. Ім падабаюцца апавяданні і казкі, вершы Віктара Шведа.

— А я на канікулах пабывала ў Гродне, — кажа Наталька Красоўская. У Гродне жыве Натальчына бабуля. Дзяўчынка хадзіла ў заапарк, захаплялася старажытнымі вуліцамі і магутнай ракой Нёман.

— І мы з бабуляй размаўлялі па-беларуску! — адзначае.

Усе Натальчыны сябры таксама хацелі б паехаць на экскурсію ў Беларусь.

У IV „б” 31 вучань (аж 19 хлопцаў). Стараста — Матэвуш Базылюк, а выхавацелька класа — настаўніца геаграфіі Валянціна Сцепанюк.

Зорка

Чарнакорань пурпуровы(2)

(„Казкі бабулі Юстыны” — працяг; пачатак у 37 н-ры)

Але ж як і не было тых трыццаці гадоў! Выглядаў Нічыпор маладзец малайцом, гадоў — не больш саракоўкі. Плячысты, дужы, на чорных кудзерах — атласная шапка, падбітая собалем, світка панская, боты — дык не ў кожнага пана такія. І нібыта сам увесь змяніўся. Усміхаецца, вітаецца, у карчму пайшоў, частуе ўсіх, усялякае цікавае расказвае — пра дзівосы, што на свеце дзеюцца. Памяць у людзей кароткая — хутка Нічыпор быў ужо лепшым сябрам у грамадзе. А як увечары выйшлі на вуліцу дзяўчаты, заспявалі песні, апынуўся чараўнік перад хатай Агаткі. А вось і сама дзяўчына — як месячны праменьчык, стройная, гнуткая, беласкурая... Наблізіўся да Агаткі Нічыпор, сказаў нешта вясёлае, ласкавае, кветку дзівоснай прыгажосці падарыў — і пайшоў сабе. А Агатка тую кветку да твару паднесла, водар нетутэйшы ўдыхнула...

Тут і скончылася шчасце лесніка Янкі, ды і Агаткі таксама. Бо перастала дзяўчына спяваць вясёлыя песні, толькі сумавала ўсё. Глядзіць перад сабою — і нібыта нічога не заўважае. Нават вернага Янку. Толькі і вяртаецца да яе весялосць, як убачыць ведзьмака Нічыпора. А той ужо — часты госць у хаце. Падарункі носіць — уся вёска збягаецца паглядзець на такое багацце. Кажуць, ужо і зямлі Нічыпор прыкупіў на ўзлессі. І новы дом будаваць збіраецца дзеля маладой жонкі... Бо справа, няйначай, да вяселля. І дарэмна маркоціцца Янка, дарэмна пераймае сваю прыгажуню ля веснічак — не глядзіць яна, не гаворыць, як зачараваная...

Вершы Віктара Шведа

Пайшло ў пяцёрку

Спытаў бацька абібока:
— Як пайшло табе на ўроках?
Тату адказаў Рыгорка:
— Пайшло сёння на пяцёрку.

Двойку ўляпіў матэматык,
Другую — гісторык заўзяты,
Потым яшчэ праз гадзінку —
Мне паланіст даў адзінку.

Хто хоча ісці ў неба

— Пазнаваць нам, дзеці, трэба
Закону Божага сакрэты.
Хто хоча з вас ісці ў неба? —
Настаўнік запытаўся гэтак.

— Чаму ты, дарагі Адаме,
Адзіны не пацвердзіў згоды?
— Даў слова сёння сваёй маме
Прыйсці дахаты, як заўсёды.

Песня падземных жыхароў

(песня гурту „Н.Р.М.")

У нашай краіне ніколі не ўзыдзе сонца,
У нашай краіне ніколі не ўзыдзе месяц.
У нашай краіне ніколі не бачна зораў,
У нашай краіне ніколі не будзе святла.
Прыпеў:
Мы жывем пад зямлёю,
Мы жывем пад асфальтам,
І нам з табою не трэба
Літасці і шкадавання.
Мы жывем пад зямлёю,
Мы — пацукі ды мышы.
Мы добра бачым у цемры,
Мы чуем кожны шолах.
У нашай краіне не чутна ўрачыстых гімнаў,
У нашай краіне няма праграмы навінаў.
У нашай краіне не трэба анкеты з пячаткай,
У нашай краіне няма палымяных прамоў.
Прыпеў...
У нашай краіне няма бананаў ды ківі.
У нашай краіне няма рыпучага снегу.
А недзе наверсе над намі жыве краіна,
Там людзі жывуць, якія не любяць нас.
Прыпеў...

Павел і Хрыстафор Пашкоўскія на магіле прадзедаў — Ласінка, 11.09.2004

Польска-беларуская крыжаванка № 38

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 34: Краса, яна, гарчыца, артыкул, ды, Нурчык, краса, нафта. Ягада, нарыс, гарт, чын, крыкун, цура, авал, цыт, антэна.

Час рыцараў

Марскі цэнтр

Часам гадаеш: чаму ў Бразіліі размаўляюць на партугальскай мове? Сама Партугалія — невялікая і непрыкметная краіна. Аднак ў сярэднявеччы яна мела вялікае значэнне. Перш за ўсё дзякуючы марскому цэнтру, які заснаваў князь Генрых Мараплавец. Ён запрасіў у свой замак людзей мора і таленавітых астраномаў. Пабудаваў астранамічны абсерваторый, стварыў вялікую бібліятэку і першую ў свеце марскую акадэмію.

Дзякуючы добрым умовам і шчодраму мецэнату, вучоныя апрацавалі новыя марскія карты ды вынайшлі шмат навігацыйных прылад. Яны — вынаходцы каравелы. Гэта невялікі, але спрытны карабель, які мог умясціць вялікую колькасць ежы і вады. Каравела магла плысці пад вострым вецер. Гэта на каравеле Хрыстафор Калумб дабраўся ў Амерыку!



Сам Генрых марыў пра заваёву Афрыкі. Яна, хоць недалёка ад Еўропы — у сярэднявеччы была таемным і нязведаным кантынентам. Партугальскі князь хацеў даплысці да поўдня Афрыкі. Ведаў пра вялікія там залежы золата і дыяментаў. Спадзяваўся таксама на прыбытак у гандлі рабамі.

Князю ўдалося адно наладзіць гандаль рабамі. У сувязі з вялікім коштам марскіх падарожжаў, Генрых пры канцы жыцця сам патануў у даўгах. ***Зорка***

(працяг будзе)

А мо і сапраўды зачараваная? Але як тады справіцца з праклятым ведзьмаком? Таму варта зірнуць — і чалавек быццам камянее. Нават Янка не змог абысціся з Нічыпорам, як з іншымі Агатчынымі залётнікамі — пагляд у ведзьмака нібыта вастрыё дзіды, упрэцца ў грудзі, і далей — ні кроку не зробіш, нібы сэрца працінае...

Толькі старая зельніца Франя змагла парадзіць Янку. Вядома, тая Франя была маёй прапрапрабабуляй. Але я не маю і дзесятай долі ейных ведаў. Дык вось, прыйшоў Янка да Франі са сваім горам. Заварыла зельніца госцю духмянай гарбаты, такой жа, як я заварваю вам. І сказала, што Нічыпор, няйначай, заваладаў нейкай рэччу Агаткі і цяпер чаруе бедную дзяўчыну, засціць ёй вочы. Рэч тую Нічыпор пэўна носіць заўсёды з сабою. І калі яе адабраць, то Агатка выйдзе з-пад ведзьмаковых чараў.

Задумаўся Янка, стаў назіраць за суперніком. І сапраўды — той увесь час нешта хавае на грудзях, за пазухай кашулі. Нейкі скрутачак нібыта.

Вось і запоіны ў кавалёвай хаце. Жаніх прыехаў на фурманцы, два кані вараныя — іскры з воч. Куфры з падарункамі, прысмакі да стала заморскія. Сядзіць Нічыпор — толькі вочы з-пад чорных брывоў бліскаюць, а побач Агатка — бледная як веснавая кветачка, прыхвачаная марозам, глядзіць на Нічыпора, нібыта позірку адвесці не можа. Вось ужо віншуюць усе заручоных, падыходзяць з прыветнымі словамі...

Падышоў і Янка. Сціпла гэтак, нават з усмешкай — нібыта змірыўся, што не яму шчасце дастаецца. Пакланіўся нявесце, вачэй не ўзняўшы. Працягнуў руку жаніху... А другой рукой як шмаргане з ягонае шыі матузок, а на тым — скрутачак...

Як ён наважыўся, як вытрываў супрацьсілы ведзьмаковай — адно каханне ягонае ведае. Бо застаўся на далоні Янкі шнар — як ад распаленага жалеза. А са скрутачка дастаў Янка пурпуровую хустку — тую самую, што калісьці сам каханай сваёй падарыў, а пасля Агатка ці то згубіла, ці скраў нехта.

Ускрыкнула Агатка, нібыта ланцугі з яе цяжкія спалі, кінулася да Янкі свайго, словы кахання прамаўляючы. І Нічыпор закрычаў. Страшна, як звер лясны. Ды ў хустку ўчапіўся — але позна: толькі маленькі пунсовы лапік застаўся ў ягоных скручаных пальцах. На вачах ва ўсіх пачаў вядзьмак рабіцца старым, нямоглым, нібыта



ўсыхаў, і ўрэшце ўпаў на падлогу чорным сухім карэньчыкам з пунсовым пялёсткам.

Узяў нехта з гасцей чорны корань ды выкінуў за плот, на сметнік.

А на наступную вясну, калі Агатка з Янкам былі ўжо шчаслівай сямейнай парай, на сметніку ля кавалёвае хаты вырасла высокая дзіўная кветка. Зусім непрыгожая, непаглядная, але валодала яна вялікай лекавай моцай. Асабліва яе карэньчыкі. Нібыта выкупляла зло, утворанае калісьці Нічыпорам.

Але ля хат усё-ткі не прыжылася кветка, паступова перабралася ў лес, у хмызнякі. Там і цяпер можна яе сустрэць.

І назвалі тую расліну — чарнакорань пурпуровы.

Людміла Рублеўская

Падляшскі народны кірмаш

Аддзел этнаграфіі Падляшскага музея пяты ўжо раз сарганізаваў у Беластоку Падляшскі кірмаш народнай разьбы, кавальства і двухасноўных тканін (перабораў). Перад ратушай — сядзібай Падляшскага музея — паміж смакоццем — хлябамі ды булкамі, нарваўскімі агуркамі ды капустай (еўрасаюзны выраб!), мёдам і іншымі вырабамі пчол ды пітвом, пад музыку педальнай гармоні Маліноўскіх з вёскі Лазукі і Тыкоціна выставілі свае працы амаль трыццаць разьбяроў, ткачоў, маляроў на шкле, кавалёў з Падляшша, Курпяў, Мазовіі і Мазур. Сярод артыстаў былі таксама мастакі з Беларусі.

Відна прэзентавалася сям'я гродзенскіх бондараў — Святланы і Міхала Куксаў з драўлянымі вырабамі — бочкамі, куфлямі, балейкамі, кубламі. Міхал Кукса — інжынер-канструктар пасля віцебскай школы па падрыхтоўцы спецыялістаў па прадукцыі драўляных вырабаў, рабіў канструкцыі для вазоў і карэт. Дзед ягоны ўжо быў сталяр і бондар, і, здаецца, талент перадаўся ўнуку, перакананаму ў гэтым, што традыцыю трэба падтрымліваць. Сам выробляе традыцыйны драўляны посуд, цікавіцца таксама дасягненнямі калег. А Мікола Скляр прывёз птушак і анёлаў. Асабліва драўляныя анёлы мелі вялікі поспех у пакупнікоў. Вырабы традыцыйна-народныя, але, вось, сярод ягоных рэзьбаў — надта сучасная прыгожая статуйка жанчыны з выпешчанымі кшталтамі. Праўда, без галавы яна і рук. Калі б мелая яна рукі, дык стала б патрабаваць усяго, як то кабета, жартуе разбяр, а і галава куды ёй...

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

У бочачках спадарства Куксаў можна трымаць і піва...

Побач — стол з вырабамі каванымі кавалём, з гродзенскай майстэрні Юркі Круша. Прадстаўляе фірму Андрэй Цюменеў, паказвае і фотаальбом найлепшых прац. Кавалі-мастакі з гродзенскай фірмы кавалі элементы ў замку Вітаўта, прымалі ўдзел у міжнародных фестывалях (першае месца за жалезнае крэсла ў Кіеве), іх вырабы ёсць ува ўсёй Еўропе (вельмі цікавая камода ў Дзюсельдарфе). Элементы акоўкі і скульптуры можна набыць у салонах продажу і ў Маскве. Тут найбольшае зацікаўленне выклікаюць падсвечнікі — і з чыстага жалеза, і пакрытыя пацінай, зробленыя „пад старыну".

З „лягчэйшымі" вырабамі — Тамара Блудава, мастачка, спецыяліст па ткацтву і саломапляценні. На яе століку — саламяныя аздобы на ёлку, куфэркі, паяскі, „бароды" з апошняга снапка, перавязаныя пругамі (паяскамі). Мастачка тлумачыць значэнне паяска — як аховы, і ў вясельным ды радзільным абрадзе, сувязь паміж збожжам і ткацтвам. Тамара Блудава мае сваіх вучняў — сваіх дзяцей, дзяцей сяброў і знаёмых, вяла спецукрс ва універсітэце.

Міра Лукша

На Дзмітрыеўскім узгорку

У гэтым годзе на святкаванне Праабражэння Гасподняга (19 жніўня) прыбыло на Дзмітрыеўскі ўзгорак у Саках шмат народу. Прыехалі вернікі з навакольных прыходаў і з аддаленых мясцовасцей. Велізарная плошча побач царкоўнай агароджы шчыльна застаўлена была машынамі. Каля сосен стаялі трактары мясцовых гаспадароў.

Царква велікамучаніка Дзмітрыя, збудаваная на ўзгорку, сярод сосен і крыжоў, крыху напамінае Грабарку. Колькасць паломнікаў павялічылася пасля заснавання, тры гады назад, Мужчынскага манастыра ў Саках. Вернікі прыязджаюць маліцца перад іконай Дзмітрыя Салунскага, пакідаюць запіскі з імёнамі хворых сямейнікаў і просяць манахаў маліцца за іх.

Святую літургію ўзначаліў мітрафорны протаіерэй Міхаіл Негярэвіч з Гайнаўкі ў саслужэнні многіх свяшчэннікаў. Паколькі было вельмі цёпла, частка вернікаў малілася звонку храма, сярод сосен, дзе даходзілі словы малітваў з гукаўзмацняльнай апаратуры. Дрэвы заглушалі гоман ад ларкоў з ласункамі і цацкамі.

— Мае бацькі ўспаміналі, што людзі здалёк хадзілі пяшком у Сакі, каб маліцца на Праабражэнне Гасподняе. У нас не зналі пра Грабарку, якая толькі пазней стала месцам шматлікіх паломніцтваў, — заявіў намеснік манастыра, архімандрыт Варсанофій.

Роўна тры гады назад у Сакі прыехалі два манахі — айцы Варсанофій і Пётр. Вернікі з Сакоў і Тапаркоў — парафіяне манастырскага прыхода — сабралі грошы і адкупілі ад гмінных улад школьны будынак. Зараз ён адрамантаваны і прыстасаваны для патрэб манастырскага жыцця. Некалькі школьных залаў перароблены на манастырскую царкву і вялікую сталовую. Іншыя кабінеты прыстасаваныя на келлі. Спачатку складана было абагрэць вялікі будынак і манахі мёрзлі. Пазней памянялі аконную сталярку і купілі новую печ для цэнтральнага ацяплення. Зараз завяршаецца перабудова мураванай хаты ў Залешанах на дом паломніка. Апрача трох манахаў у мужчынскім манастыры жыве некалькі паслушнікаў. У рамонтных работах памагаюць ім прыхаджане, семінарысты, паломнікі і нанятыя работнікі.

— Гэта святы велікамучанік Дзмітрый кіруе нашым жыццём, — любіць паўтараць айцец Варсанофій, які вясной атрымаў званне архімандрыта. У лістах паломнікі паінфармавалі архімандрыта, што пасля малітваў перад іконай святога Дзмітрыя выздаравелі ад пухліны і іншых хвароб. Перад святкаваннямі царкву наведаў разам з беластоцкімі паломнікамі айцец Яўгеній Канаховіч, які да нядаўна служыў на прыходзе ў Ялоўцы. Напомніў ён пра сваё цудоўнае аздараўленне ў дзяцінстве. Пасля таго, як конь ударыў яго, чатырохгадовага хлопчыка, у галоўку, пачаў ён траціць зрок і слабець. Лекар даваў малыя шанцы на аздараўленне. Бацькі, якія жылі ў Кляшчэлях, рашыліся прывезці сынка ў Сакі і прылажыць да цудадзейнай іконы велікамучаніка Дзмітрыя.

— Калі везлі мяне на возе, я цалкам заслаб. Бацькі думалі, што я памёр і палажылі мяне на салому. Перад царквой маці прылажыла мне да вуснаў люстэрка і заявіла: „Бацьку, ён жыве". Калі толькі прылажылі мяне галоўкай да іконы велікамучаніка Дзмітрыя, я адчуў прыток сіл і ўсклікнуў: „Мамачку, я бачу". Вярнуўся мне зрок, які я амаль страціў і я стаў хадзіць, — сказаў айцец Яўгеній. Пасля, праз 74 гады ён добра бачыў. Толькі з лістапада мінулага года ізноў стаў траціць зрок і зараз ужо не можа чытаць.

Пры ўваходзе на цвінтар праводзіўся збор грошай на будову цэркваў. Бедныя прасілі грашовай успамогі на свае патрэбы. Апошнім часам можна спаткаць штораз больш такіх людзей, якія разлічваюць на фінансавую падтрымку вернікаў.

Святкаванні закончыў хрэсны ход. Вернікі стараліся падысці да архімандрыта Варсанофія, які свяціў яблыкі і іншыя фрукты. Пасля богаслужэння людзі набіралі асвячоную ваду і доўга стаялі ў чарзе, каб прылажыцца да малой іконы велікамучаніка Дзмітрыя, пры якой знаходзіцца часціца ад мошчаў святога.

Аляксей Мароз

„Рускі" тост і ўсё

За поспех Падляшскага ваяводства і падляшскіх артыстаў, — такі тост таксама па-беларуску ўзнёс у час святкавання 491-годдзя Падляшскага ваяводства маршалак рэгіёна Януш Кшыжэўскі.

Быў гэта, на жаль, адзін з нешматлікіх беларускіх акцэнтаў на гэтых шумных, у гэты раз аж у тры дні, „абходах", спалучаных ужо са шматгадовым Niepospolitym Artystów Poruszeniem, значыць, адкрыццём мастацкага сезона, перш за ўсё тэатральнага. Леташні (у адзін дзень) юбілей нараджэння ваяводства быў сарганізаваны першы раз, пасля таго, як частка беластоцкіх гісторыкаў палічыла, што датай, на якую можна спасылацца, з'яўляецца 1513 год і факт назначэння каралём Зыгмунтам Старым падляшскім ваяводам русіна Івана Сапегі. Праўда, год таму ў „Ніве" гісторык Алег Латышонак сцвердзіў, што наша Падляшскае ваяводства (вызначанае ў канцы XX ст. пры ўладзе Ежы Бузка) ніяк не адносіцца да мінулага, але юбілейных мерапрыемстваў было шмат. Першы і другі день у Беластоку гэта канцэрт, драматычная пастаноўка, паказы моды і танца, выстава, каляровы карагод з-пад драматычнага да лалечнага тэатраў, паэтычныя сустрэчы. Трэці дзень (таксама поўны імпрэз засяроджаных вакол мясцовага польска-каталіцкага асяроддзя) быў адсвяткаваны ў першай сталіцы ваяводства — Драгічыне.

На жаль, беларускія элементы — і ўвогуле меншасныя — былі ўпісаны ў сцэнарый урачыстасці быццам бы выпадкова. Беларускіх было ледзь два. Першы — Начное паэтаў poruszenie і ўдзел у ім Міры Лукшы. Паэтэса і журналістка „Нівы" чытала свае вершы, сярод іх — „Абрад" па-беларуску. Гэты твор, хоць было ўжо каля поўначы, шматлікая публіка ў Лялечным тэатры прыняла гарачымі апладысментамі. Цёпла былі таксама прынятыя вершы Ежы Плютовіча. На жаль, сам аўтар не быў прысутны, ягоныя творы чытаў акцёр Марэк Тышкевіч. Начное спатканне паэтаў сарганізаваў Багдан Дудко, галоўны рэдактар літаратурна-мастацкага часопіса „Kartki". На жаль, няшмат мела яно супольнага з самым днём нараджэння ваяводства. Таксама як, дарэчы, і канцэрт у беластоцкім амфітэатры, у якім выступіў гурт „Zero 85" з вядомым беларускім вакалістам Юркам Асеннікам. Тое выступленне было другім беларускім элементам. Дарэчы, абедзве імпрэзы адбыліся ў першым з трох дзён, які ў заяве падляшскага ваяводы нават не ўспамінаўся ў праграме святкавання.

Хоць падляшскі маршалак ўзнёс юбілейныя тосты на чатырох мовах, як казалі арганізатары — ужываных на Падляшшы: па-польску, па-беларуску, па-ўкраінску і па-літоўску і хоць старшыня падляшскага сейміка Збігнеў Кшывіцкі падкрэсліў у сваім выступленні ў Драгічыне значэнне шматкультурнасці і шматнацыянальнасці для рэгіёна, зусім ужо не бачна было ўкраінскіх і літоўскіх элементаў.

У наступным годзе, па-за Беластокам, ваяводскі дзень нараджэння мае быць адсвяткоўваны ўжо не ў Драгічыне, а ў Тыкоціне, Мельніку, Бельску-Падляшскім або ў Супраслі. Маршалкава прэс-інфарматарка Бажэна Бэднарэк мяркуе, што найбольш праўдападобным будзе Тыкоцін, горад да II сусветнай вайны з шматвяковымі яўрэйскімі традыцыямі. Сёлета, аднак, тост па-яўрэйску маршалак не ўзнёс.

Мацей Халадоўскі

Браніслаў Эпімах-Шыпіла

Браніслаў Эпімах-Шыпіла нарадзіўся 145 гадоў таму, 4 верасня, праўдападобна старога стылю, бо такі тады абавязваў у Расійскай імперыі. На жаль, на адрозненне старога і новага стыляў надта рэдка звяртаюць увагу беларускія даследчыкі.

Беларусь у гэтым годзе святкуе падвойныя ўгодкі Браніслава Эпімаха-Шыпілы, таксама і 70-я ўгодкі смерці яго ў Ленінградзе 6 чэрвеня 1934 г. Карыстаючы нагодай падвойных угодкаў хачу распавесці чытачам „Нівы" пра цікавую знаходку ў Гданьску. Пару гадоў таму назад у Гданьску пры рэкламным шуме СМІ адкрываўся французамі гіпермаркет „Auchan". У „Głosie Wybrzeża" наконт новай інвестыцыі выказвалася Катажына Эпімах-Шыпіла. Менавіта гэтае прозвішча — пададзенае тоўстым шрыфтам — прыцягнула маю ўвагу. Пазваніла я ў гіпермаркет пытаючыся пра кантакт са спадарыняй Эпімах-Шыпілай. Фірма, абараняючы свае інтарэсы, не надта ахвотна пагадзілася даць ейны тэлефон. Трэба было даказаць, што званю ў сямейных, а не ў фірменных інтарэсах. Атрымала я нумар мабільнага тэлефона. З размовы з Катажынай Эпімах-Шыпілай аказалася, што яна з'яўляецца пляменніцай прафесара Браніслава Эпімаха-Шыпілы і захоўвае як рэліквію ягоны здымак, падораны яе дзядулю Вацлаву і бабулі Эміліі. Здымак дастаўся ёй у спадчыну пасля смерці бацькі, Часлава Эпімаха-Шыпілы.

Дамовіліся на сустрэчу спярша ў мяне, пасля ў Катажыны Эпімах-Шыпілы. Уласніца здымка вельмі цікавіцца сваімі продкамі і таксама Браніславам Эпімахам-Шыпілам. Хоча выбрацца нават у іхнія родныя мясціны. Сама яна па адукацыі раманістка, працуе перакладчыцай французскай мовы. Так і трапіла ў фірму „Auchan".

Здымак Браніслава Эпімаха-Шыпілы, на жаль, не мае даты, хаця на яго адвароце захаваўся дарчы надпіс на польскай мове: „Kochanemu Kuzynowstwu Wacławowi i Emillii Epimachom-Szypiłłom — Bron. Epimach-Szypiłło". На адвароце здымка знаходзіцца фірменны знак фатографа І. І. Недешева з Пецярбурга, што сведчыць пра паходжанне здымка з дарэвалюцыйнага перыяду.

Спадарыня Катажына расказала пра знаёмства яе бацькі з прафесарам Эпімахам-Шыпілам. Гэта вельмі цікавая сямейная гісторыя. Прадзед Катажыны, Войцех Эпімах-Шыпіла, валодаў фальваркам Юркава ў воласці Лужкі Дзісненскага павета, Загацкай парафіі. Быў ён жанаты з Аляксандрай з Няміраў, з якой меў 12 дзяцей. Адным з іх быў дзед Катажыны — Вацлаў (1867 года нараджэння). Каталіцкая сям'я Эпімахаў-Шыпілаў вельмі шанавала цара, асабліва пасля 1905 г. Вацлаў Эпімах-Шыпіла быў царскім чыноўнікам, працаваў на чыгунцы. Быў касірам І класа чыгункі ў Пецярбургу. Ажаніўся з Эміліяй Драздовіч з Качанова. Мелі пяцёра дзяцей: Часлава (1905-1987), Ядвігу (1909 г.н.), Вітальда (1910—1912), Мар'яна (1912 г.н.), Альдону (1921—1997). Часлаў нарадзіўся ў Малой Вішэры каля Пецербурга. Зарабіўшы грошы на чыгунцы, Вацлаў купіў ад княжных Максутавых Папоўку, 30 кіламетраў ад Пецярбурга, недалёка чыгуначнай станцыі. Там і прайшло дзяцінства Вацлававых дзяцей. Як успамінае Ядвіга, якая зараз жыве ў Торуні, у Папоўцы было „неба на зямлі". Была там тысячагадовая пушча. Вацлаў кавалак пушчы выкарчаваў і пабудаваў драўляны двор. Побач знаходзіліся ставы і дзікая пушча. Вацлаў даязджаў на працу ў Пецярбург з недалёкай чыгуначнай станцыі. Падарожжа займала каля адной гадзіны. Калі падраслі дзеці і споўнілася ім 10 гадоў, таксама даязджалі ў Піцер у гімназіі пры касцёле св. Кацярыны.

Найстарэйшы Часлаў пачаў адукацыю ў мужчынскай гімназіі ў 1915 г. Там і сустрэўся з Браніславам Эпімахам-Шыпілам, які выкладаў лацінскую мову. Прафесар зацікавіўся вучнем, асабліва яго прозвішчам. Аказалася, што радавод іх з тых самых ваколіцаў — Браніслаў Эпімах-Шыпіла нарадзіўся ў недалёкім ад Юркава фальварку Будзькаўшчына — той жа Загацкай парафіі. Складаў генеалогію свайго роду. Са знаёмства з вучнем Браніслаў Эпімах-Шыпіла стаў частым госцем у Папоўцы. Спадарыня Ядвіга памятае гэтыя сустрэчы, калі пры газавай лямпе вяліся дыспуты на польска-беларускія тэмы. Браніслаў Эпімах-Шыпіла быў беларускім дзеячам у Пецярбургу, усведамляў нацыянальна беларускую моладзь, якая там вучылася, ангажаваўся ў выдавецкую дзейнасць суполкі „Загляне сонцэ і ў нашэ ваконцэ". Сваім родзічам таксама даказваў, што яны беларусы. Паколькі Вацлаў цвёрда адстойваў сваю польскасць, зрабіць з яго сям'і беларускай Браніславу не ўдалося. Тым не менш адносіны між імі былі сяброўскія. Браніслава памятаюць дасюль дзеці Вацлава — Ядвіга і Мар'ян. Ядвіга Сыльвэстровіч лічыць, што гэтыя дыспуты ў Папоўцы былі для іх — дзяцей — сапраўдным універсітэтам. Сваімі ўспамінамі пра Браніслава Эпімаха-Шыпілу Ядвіга падзялілася некалі з Мар'янам Пецюкевічам, які таксама жыў у Торуні. Пару гадоў таму назад напісала ўспаміны таксама на просьбу Ветрынскай школы, дзе знаходзіцца музей прысвечаны Браніславу Эпімаху-Шыпілу.

Надпіс на адвароце здымка: „Kochanemu Kuzynowstwu Wacławowi i Emillii Epimachom-Szypiłłom — Bron. Epimach-Szypiłło"

Сям'я Вацлава падтрымлівала блізкія кантакты з Браніславам да 1923 года, калі вырашылі выехаць у Польшчу, у родны маёнтак Юркава. Пасля кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. мужчынскую і жаночую гімназіі пры касцёле св. Кацярыны закрылі, арганізуючы каадукацыйную, саджаючы за адной партай хлопца і дзяўчыну. Тады ўжо лацінскай мовы Браніслаў вучыў таксама і Ядвігу, і Мар'яна. Перад выездам у Польшчу Вацлаў намаўляў Браніслава ехаць з імі. Аднак той адмовіўся — шкада было расставацца з 5-тысячнай бібліятэкай, якую Браніслаў сабіраў усё жыццё. Пры тым маёнтак Юркава пасля Рыжскага мірнага дагавору апынуўся ў Польшчы, а Браніславаў маёнтак Залессе каля Ветрыны (дзе правёў дзяцінства) апынуўся па другі бок мяжы. Дарэчы, дзяржаўная мяжа праходзіла за гумном Качанова — маёнтка Эміліі. На развітанне Браніслаў Эпімах-Шыпіла падарыў Чаславу пярсцёнак з родавым гербам. На жаль, пасля ў ваеннай буры пярсцёнак недзе згубіўся.

Прыехаўшы ў збуранае вайной гняздо, трэба было ўсё пачынаць ад пачатку, ад рамонту дому. У І сусветную вайну там праходзіў фронт.

Дзеці Вацлава падраслі і пайшлі вучыцца ў Вільню — Ядвіга пачала штудзіраваць права, пасля перайшла на медычны факультэт. Пасля яго заканчэння паехала працаваць у Кельцы. Мар'ян паступіў на права, але вайна не дазволіла закончыць студыяў. Часлаў закончыў Дзяржаўную тэхнічную школу (дарожнае аддзяленне) і як чыгуначны дарожны інжынер з 1929 г. працаваў на станцыях чыгункі Крулеўшчына — Бярэсце і ў Кобрыне. У 1939 г. быў змабілізаваны ў армію „Палессе" ген. Клеберга і змагаўся пад Коцкам. Адтуль трапіў у нямецкі лагер для ваеннапалонных у Вальдэнбергу. Пасля вайны прыехаў у Польшчу. Працаваў па сваёй прафесіі ў Лодзі, з 1958 г. — у Познані. Удзельнічаў у адбудове чыгуначных мастоў. У 1954 г. нарадзілася дачка Катажына.

Браніслаў Эпімах-Шыпіла ў 1925 годзе са сваёй бібліятэкай пераехаў у Мінск і працаваў у Інстытуце беларускай культуры, спярша рэдактарам, а з 1927 г. — старшынёй камісіі па складанні слоўніка жывой беларускай мовы. 18 ліпеня 1930 г. быў арыштаваны па справе Саюза вызвалення Беларусі і — на 71 годзе жыцця — трапіў на два месяцы ў турму. Восенню 1930 года выехаў у Ленінград, дзе беспрытульны, без сродкаў на жыццё, памёр 6 чэрвеня 1934 г.

Вацлаў памёр раптоўна ў 1939 г. у Юркаве, звозячы дрэва на будову новага дома. Пахаваны на родавым могільніку. Яго жонка Эмілія памерла ў 1952 г. у Торуні. Па Юркаве да сёння нічога не асталося. Няма нават следу па родавых могілках. Тое ж самае і па Папоўцы, дзе сустракаліся пляменнікі з роду Эпімахаў-Шыпілаў. Ды што тут казаць пра фальваркі, калі і магіла Браніслава Эпімаха-Шыпілы невядома дзе. Як кажа спадарыня Катажына, у сям'і чамусьці гаварылася, што прафесара саветы закатавалі на Салаўках (быццам такая інфармацыя была ў польскай віленскай прэсе). Яна, каб захаваць для будучых пакаленняў памяць аб родзе, дала сыну Тамашу сваё прозвішча — Эпімах-Шыпіла. А Браніслаў у гісторыі беларускай культуры меў шчасце застацца ў памяці нашчадкаў. Пра яго пісалі ў розным часе Адам Станкевіч, Рыгор Семашкевіч, Аляксей Каўка і іншыя. Кожныя пяць гадоў ладзяцца на яго радзіме, у Ветрыне, чытанні. Адбываюцца яны і зараз.

Лена Глагоўская

Ёсць сярод беларусаў мастакі, здольныя на ўвасабленне як восені, так і іншых пораў года на сваіх малюнках...

www.tatarnikov.com

Празрыстае восеньскае паветра хочаш не хочаш прыдае думкам нейкае лірычнае афармленне. Фарбы наваколля яскравыя, але не такія кідкія, як яшчэ некалькі тыдняў таму. І падаецца, што неяк зафіксаваць гэтую няважкую як восеньскае павуцінне прыгажосць немагчыма. Але на самой справе ёсць сярод беларусаў мастакі, здольныя на ўвасабленне як восені, так і іншых пораў года на сваіх малюнках. Адзін з іх — Павел Татарнікаў.

Калі карыстальнік сеціва набярэ адрас http://www.tatarnikov.com, то перад ягонымі вачыма адкрыецца арыгінальнае выяўленне галоўнай старонкі аўтарскага сайта мастака-графіка. Большую частку гэтай старонкі займае светла-карычневы малюнак дамоў і дрэў. Ніжэй ідзе подпіс мастака і выхады да іншых старонак і рубрык сайта. Але менавіта вышэйазначаны малюнак бязлюдных будынкаў, узгоркаў і голых дрэў прадвызначае агульны кірунак прац Паўла Татарнікава — ён малюе „сцішанае наваколле".

Рубрыка „Біяграфія" ўмяшчае ў сябе некалькі фотаздымкаў мастака, а таксама галоўныя даты яго творчай біяграфіі, з чаго мы можам даведацца, што Павел Татарнікаў паходзіць з сям'і мастакоў і нарадзіўся ў 1971 годзе ў Брэсце. Чалавек без перабольшвання таленавіты, у пацвярджэнне чаго праз 30 гадоў пасля нараджэння ён становіцца акадэмікам Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва.

Наступная старонка „Выставы і ўзнагароды" распавядае пра тыя дыпломы, прэміі і адзначэнні, якія за свой не надта яшчэ працяглы творчы шлях атрымаў Татарнікаў, а таксама пералік выстаў, у якіх Павел прымаў удзел. Зразумела, для кожнага мастака менавіта выставамі вызначаецца вартасць ягоных твораў. Для „нашага" мастака такі пералік пачынаецца з 1992 года. Бліжэй да нашых дзён спіс папаўняецца персанальнымі выставамі графіка.

Рубрыка „Ілюстрацыі" дае нам магчымасць убачыць мноства кніжак, вокладкі якіх упрыгожаны малюнкамі Татарнікава. Тут і „Кароль Лір", і „Гамлет", і „Аповесць мінулых гадоў", і „Песня пра паход Ігара" і многае іншае, што выдавалася ў Мінску цягам апошніх пяці гадоў.

На далейшай старонцы, што носіць назву „Галерэя", якраз раскрываецца ўвесь стыль малявання Паўла Татарнікава. Першы малюнак „Сіні лес", трэба разумець, перадае зімовы настрой мастака. Тое самае можна сказаць і пра „Прагулку". А вось палатно з назвай „Мая вежа" паказвае, што вобраз ягонай малой радзімы — Брэстчыны — вельмі блізкі мастаку. На малюнку своеасаблівае выяўленне Белай (Камянецкай) Вежы. Дарэчы, вежа прысутнічае і на яшчэ двух малюнках.

Далёка не ўсе творы Паўла Татарнікава ўдаецца „расшыфраваць" адразу, тым больш што надпісаў няма ні пад адным. Тады дапамагае „мышка" — калі навесці стрэлкай на малюнак, то з'яўляецца не толькі назва, але і спосаб малявання, матэрыялы і памеры карціны.

Апошняя старонка „Кантакт" змяшчае ў сабе паштовы адрас, нумар тэлефона і адрас электроннай пошты Паўла Татарнікава. Таму жадаючыя без праблем змогуць не толькі пачаць ліставанне з акадэмікам-графікам, але і паразмаўляць з ім.

Уладзімір Лапцэвіч

Суверэнная гісторыя айчыннай зборнай па футболе пачалася 28 кастрычніка 1992 г. хатнім сяброўскім матчам супраць Украіны (1:1)...

Беларусь, беларусы...

Аптымістычны старт

Беларускія нацыянальная і моладзевая дружыны паспяхова пачалі новыя адборавыя футбольныя турніры. Наша малодшая каманда ў рамках моладзевага чэмпіянату кантынента ў гасцях адолела равеснікаў з Нарвегіі — 3:2. Дарослая зборная ў межах кваліфікацыі да чэмпіянату свету змагла таксама адабраць ачкі ў вікінгаў — 1:1.

Асабліва прыемна за дружыну трэнера Юрыя Пунтуса, якая здолела ўзяць рэванш за крыўдную паразу ад нарвежцаў тры гады таму — 1:5. Поспехам трэба лічыць і нічыю каманды пад кіраваннем Анатоля Байдачнага, бо беларускія каманды звычай кепска выступаюць на Скандынаўскім паўвостраве.

Перад выступам у Осла нашыя (далей гутарка пойдзе толькі пра нацыянальную дружыну) у таварыскай гульні адолелі ў гасцях Турцыю (2:1) — бронзавага прызёра апошняга чэмпіянату свету. Гэта істотна павысіла рэйтынг беларускай дружыны, на жаль, пакуль нізкі. А ўвогуле суверэнная гісторыя айчыннай зборнай па футболе пачалася 28 кастрычніка 1992 года хатнім сяброўскім матчам супраць Украіны (1:1). Усяго за 12 гадоў нашыя згулялі 82 гульні (агульны баланс негатыўны — 21 перамога, 21 нічыя і 40 паразаў). Акрамя таварыскіх сустрэчаў Беларусь выступала ў пяці адборавых цыклах. Вынікі гэтых спабораў пераважна няўдалыя. Лепшым за гэты час стала трэцяе месца (з шасці прэтэндэнтаў) у 2000/2001 гадах. У новым цыкле лёс не пашкадаваў нашых, вызначыўшы ім вельмі сур'ёзных супернікаў. Акрамя Беларусі ў 5-ю адборавую групу трапілі Італія, Славенія, Шатландыя, Нарвегія і Малдова. З італьянцамі ў нас станоўчы баланс стасункаў (!), таксама роўны з малдаванамі, са славенцамі беларусы яшчэ ніколі не сустракаліся, з іншымі — адмоўныя паказчыкі.

Сама дасведчаным у складзе беларускай дружыны ёсць выхаванец гродзенскага футбола Сяргей Гурэнка. На яго рахунку ўжо 69 матчаў, бальшыню якіх ён правёў з капітанскай павязкай. На клубным роўні Гурэнка пасля гродзенскага „Нёмана" выступаў у маскоўскім „Лакаматыве", пазней у вышэйшых дывізіёнах Італіі ды Іспаніі, зараз зноў за расійскіх „чыгуначнікаў". Лепшым снайперам нацыянальнай зборнай не так даўно стаў малодшы з братоў Рамашчанкаў (старэйшы, Міраслаў, быў змушаны рана скончыць кар'еру з-за сур'ёзнай траўмы) — Максім, які забіў 10 галоў. У сустрэчы з нарвежцамі выратавальны гол забіў наш форвард з ваёўным прозвішчам Кутузаў. Віталь зараз знаходзіцца ў складзе генуэзскай „Сампдорыі", куды аддадзены ў арэнду тытулаваным „Міланам", у якога перабор класных нападнікаў. Кутузаў цяпер адзіны беларус у італьянскай „Серыі А".

Важкасць выніковай раўнавагі з нарвежцамі асабліва падкрэслівае факт адсутнасці ў складзе мацнейшых гульцоў Беларусі апошніх гадоў — Валянціна Бялькевіча і Аляксандра Глеба. Абодва хаўбекі былі змушаны прапусціць стартавую гульню — лідэр кіеўскага „Дынама" з-за траўмы, а паўабаронец нямецкага „Штутгарта" па прычыне дыскваліфікацыі (Глеба не будзе на полі яшчэ ў двух афіцыйных гульнях). Наступны матч беларусы згуляюць дома 9 кастрычніка, калі будуць прымаць малдаван. Самы час браць рэванш за паразу ў мінулым розыгрышы, якая адкінула нашых у групе на апошняе 5-е месца.

Уладзімір Хільмановіч

ЗВАРОТ ДА ЭЎРАПЕЙСКАЙ СУПОЛЬНАСЬЦІ

Мы, Беларусы, удзельнікі Сустрэчы Беларусаў Эўропы зь Беларусі, Бэльгіі, Вялікае Брытаніі, Гішпаніі, Італіі, Лацьвіі, Летувы, Нямеччыны, Польшчы, Расеі, Украіны, Чэхіі, Швэцыі і Эстоніі, сабраўшыся ў Празе Чэскай 28-29 жніўня 2004 году зьвяртаемся да дэпутатаў Эўрапейскага Парляманту, прадстаўнікоў эўрапейскіх інстытуцыяў ды ўрадаў краінаў дэмакратычнае Эўропы і іх грамадзян з гэтаю заявою:

Мы, Беларусы, зьяўляемся прадстаўнікамі нацыі, якая здаўна належыць да Эўрапейскае супольнасьці і цывілізацыі са сваёй гісторыяй, традыцыямі, культурай ды спрадвечнай мовай;

Зыходзячы з таго,

— што рэжым, які сёньня кіруе ў Беларусі, зьяўляецца антыдэмакратычным і нелегітымным,

— што Беларусам у Беларусі адмоўлена ў праве вольнага вырашэньня будучыні сваёй Бацькаўшчыны, мець адукацыю на роднай мове ды выбіраць прадстаўнікоў, якія б з адказнасьцю і сумленьнем дэмакратычна кіравалі краінаю ды баранілі яе інтарэсы, свабоду і незалежнасьць,

— а нутраныя ды зьнешнепалітычныя ініцыятывы рэжыму Аляксандра Лукашэнкі ня могуць быць прызнаныя за адпаведныя закону, асабліва інсцэніроўкі „ўсенародных" галасаваньняў, фальсыфікацыі выбараў ды падпісваньне дамоваў, што вядуць да абмежаваньня сувэрэнітэту і незалежнасьці Рэспублікі Беларусь і яе нэўтралітэту,

— маючы за стратэгічную мэту сваёй дзейнасьці інтэграваць Рэспубліку Беларусь у аб'яднаную Эўропу,

— мы лічым, што Эўрапейскі Зьвяз павінен заняць актыўную пазыцыю ў дачыненьні да Беларусі ды даць зразумець яе народу, што ён будзе вітаны ў дэмакратычнай Эўропе. Таму мы зьвяртаемся да Вас с просьбаю, каб у межах новае эўрапейскае палітыкі суседзтва (European Neighbourhood Policy) ды пляну дзеяньняў у дачыненьні да Беларусі, які зараз узьнікае, былі створаныя як мага больш спрыяльныя ўмовы для падтрымкі незалежных ініцыятываў, распаўсюду непадцэнзурнае інфармацыі, мясцовага самакіраваньня, адукацыйных ды дасьледчых праектаў, якія будуць незалежнымі ад уладаў. Асаблівае значэньне для будучыні мела б адкрыцьцё адукацыйных праектаў і праграмаў абмену ЭЗ для студэнтаў і сьпецыялістаў зь Беларусі, якія не залежылі б ад рэжыму й яго інстытуцыяў. Падмуркам для пашырэньня незалежнай інфармацыі пра ЭЗ было б заснаваньне прадстаўніцтва ЭЗ непасрэдна ў Беларусі ды адкрыцьцё незалежных інфармацыйных асяродкаў ЭЗ.

Мы вітаем заснаваньне камітэтаў за дэмакратыю ў Беларусі ў нацыянальных парлямантах па аналёгіі з чэскім сэнацкім камітэтам, які ўзьнік год таму, а ягоная дзейнасьць эфектыўная й карысная.

Мы заклікаем таксама ўрады й народы дэмакратычнае Эўропы, каб падтрымалі беларускія меншасьці на сваіх тэрыторыях.

Бяручы пад ўвагу сёньняшняе становішча ў Рэспубліцы Беларусь і шматлікую прысутнасьць Беларусаў у краінах Эўрапейскага Зьвязу, дзеля шчыльнейшых кантактаў і супрацоўніцтва мы ствараем Дэмакратычны Форум Беларусаў Эўропы.

Мы рады, што тут, у Празе, якая ёсьць традыцыйным месцам актыўнасьці беларускіх інтэлектуалаў, дзеячоў культуры і студэнтаў, якія вымушаныя былі пакінуць сваю Бацькаўшчыну ды хавацца ад перасьледу рознага кшталту, мы адчуваем шматгадовую гасьціннасьць і разуменьне. Чэхі як і іншыя народы Сярэдняе ды Ўсходняе Эўропы самі спазналі таталітарныя рэжымы, калі яны маглі толькі марыць пра грамадзянскія правы, а перспектыва пераменаў здавалася шмат каму малаверагоднай. Сёньня, усяго 15 гадоў пасьля вызваленьня ад тых рэжымаў, гэтыя народы зьяўляюцца паўнапраўнымі сябрамі Эўрапейскага Зьвязу. А гэта дае нам надзею, што яго сябрам стане дэмакратычная Беларусь.

Прага 29 жніўня 2004

Безгаспадарная чыгунка

Зноў узнік закалот наконт чыгункі. Піша аб тым Мацей Халадоўскі ў публікацыі „Ці гэта ўжо канец?" („Ніва" н-р 33 ад 15.08.2004 г.) Канфлікт паміж Маршалкоўскай управай і Рэгіянальным прадпрыемствам перавозаў у Беластоку не прадбачвае нічога добрага, асабліва паўднёва-ўсходняй частцы рэгіёна.

Асноўнай памылкай у рэструктурызацыі чыгункі была ліквідацыя „старых" дырэкцый ПКП. Тады ўвялічыўся лік чыноўнікаў на высокіх пасадах з вялікімі зарплатамі. Намножыўся лік паасобных чыгуначных устаноў. І кожная на свой спосаб дабівалася прыбытку. У народзе кажуць: „Дзе кухарак шэсць, там няма чаго з'есць". Чарговыя рэструктурызацыі ў гэтых фірмах зводзіліся да абмежавання работнікаў пры захаванні штатаў адміністрацыйных чыноўнікаў з высокімі зарплатамі. Эканамічны рэзультат такіх рэструктурызацый быў мізэрны. Напрыклад, у пачатках дзевяностых гадоў ў гандлёва-перавозачнай службе ў Чаромсе ліквідаванне штатаў пачалося ад калектыву кандуктараў. Затым пайшлі іншыя групы кваліфікаваных работнікаў. На канец дакаціліся да таго, што ў Чаромху пасылалі такіх жа работнікаў з адлеглых Седльцаў ці Варшавы, якім трэба было плаціць камандзіровачныя. Такое ж можна прыкмеціць у прадпрыемстве інфраструктуры. Лік пуцявых работнікаў абмежавалі да мінімуму, а для абмену шпалаў зараз прыцягваецца прыватная фірма і плацяць ёй вялікія грошы. А што ў прадпрыемстве маёмасці? У перыяд трансфармацыі засталося шмат непрыдатных для фірмы грунтаў. Чаму ж не перадаць іх гмінным самаўрадам дзеля пагашэння падатку? Чаромхаўская гміна выступала з такой прапановай, але чыгуначныя начальнікі асталіся глухімі. Іх не хваляваў рост даўгоў. Прыклады негаспадарнасці можна прыводзіць дзесяткамі.

Мне здаецца, што наступіў час узяцца за канкрэтную работу, а не чакаць нябеснай манны як гэта робіць дырэктар Рэгіянальнага прадпрыемства перавозаў у Беластоку. Прызначаныя Маршалкоўскай управай субвенцыі дзеля захавання лакальных спалучэнняў у гэтым годзе павінны задаволіць спадарыню Галіну Кужыну. Так мяркуюць шматлікія працаўнікі чыгункі. А наконт лініі Чаромха — Беласток магу сказаць, што лінія будзе захавана. „Спадзяемся ў канцы верасня атрымаць новы рэйкавы аўтобус ды хуткасць увялічваецца даа 50 км/гадз.", — канстатаваў войт. Дзеля гэтай справы прыспешваецца абмен шпалаў, які мае закончыцца 20 верасня.

* * *

На гравейцы з Рэпчычаў у Кляшчэлі, на рэчцы Нурэц (перад чыгуначным пераездам на шляху Чаромха — Беласток) знаходзіцца бетонны мост. Ніякай балюстрады пры ім няма. Мост знаходзіцца на павароце. Мясцовыя жыхары аб тым ведаюць, але для шафёраў, якія едуць на вадасховішча, мост з'яўляецца пасткай. Хопіць малая няўвага пры мінанні і можна апынуцца ў рэчцы. Дарога так засыпана жвірам, што не відаць бетонных абочын моста. На маю думку, дарожная служба павінна паклапаціцца ды паставіць адпаведны знак і забяспечыць мост бар'ерам. Спадзяюся, што бурмістр Кляшчэляў вырашыць праблему неадкладна, пакуль не здарыўся выпадак.

Уладзімір Сідарук

Небяспечныя дарогі

За перыяд летніх канікул на польскіх дарогах здарылася звыш 8,8 тысяч катастроф, у якіх страціла жыццё 957 асоб, а 11,7 тысяч чалавек паранена. У гэту сумную статыстыку ўвайшоў і выпадак на скрыжаванні шашы Бельск-Падляшскі — Гайнаўка з дарогай Крывая — Шчыты-Дзенцялова, які здарыўся ў суботу 24 ліпеня. У выніку сутыкнення легкавушкі з аўтобусам памерлі чатыры асобы, а тры паранены. Раней у гэтым месцы загінулі ўжо звыш больш за дзесяць асоб; пісала пра гэта „Ніва" 6 красавіка 1997 года ў артыкуле п.з. „Скрыжаванне смерці".

Паводле інфармацыі Яна Апалінскага, першага намесніка павятовага каменданта паліцыі ў Бельску-Падляшскім, стан бяспекі на дарогах павета, вызначаемы колькасцю дарожных выпадкаў, ад двух гадоў трымаецца аднаго ўзроўню. У мінулым годзе зафіксавана 76 катастроф, а годам раней — 85. Колькасць сутыкненняў пабольшала з 378 да 439, з чаго ў самым Бельску 143. З 12 да 16 вырасла колькасць забітых, а лік параненых упаў з 112 да 90. Прыведзеныя лікі ў супастаўленні з узрастаючай колькасцю ўдзельнікаў дарожнага руху і дэградацыяй дарог не павінны трывожыць.

Паліцыянты з бельскай Павятовай камендатуры затрымалі ў мінулым годзе 210 вадзіцельскіх дазволаў і 557 рэгістрацыйных дакументаў. За парушэнні дарожных правіл аштрафавана 2 860 асоб на суму 366 505 злотаў (годам раней 2 108 чалавек на 226 590 зл.). Рост на амаль траціну наступіў у выніку пашырэння дыяпазону штрафавання і „дзейнасці" фотарадараў.

У 2003 годзе на дарогі Бельскага павета прыбыло каля шасцісот машын. Узбуйненне дарожнага руху павышае небяспеку дарожных выпадкаў, — сцвярджае віцэ-камендант.

Міхал Мінцэвіч

Вялікае беспрацоўе ў нашым рэгіёне давяло да сітуацыі, што амаль кожны з нас мае сярод сваіх сямейнікаў ці знаёмых асоб, якія шукаюць працу. Каб неяк памагчы такім людзям, вядзем рубрыку „Дапамагаем з «Нівай»". Побач бясплатна будзем змяшчаць аб'явы людзей, якія шукаюць працу або могуць даць працу. Сардэчна запрашаем усіх чытачоў дасылаць у рэдакцыю свае прапановы. Рубрыку вядзе Паўліна Шафран-Асташэвіч, з якой можна кантактавацца па мабільніку нумар 0600 635 425 (або ў рэдакцыі па панядзелках ад 10 да 12 — тэл. 743 50 22).

ШУКАЮ ПРАЦУ

• Жанчына (25 гадоў), спецыяліст па справах маркетынгу і продажу — вышэйшая адукацыя, веданне камп'ютэра, добрае веданне рускай мовы і тэхнічнай тэрміналогіі, пільна шукае працу, тэл. 0 503 713 915.

• Прадавец (32 г.), сярэдняя адукацыя, веданне камп'ютэра, нямецкай мовы, правы кат. В, патрабуе працы ў Гайнаўцы, тэл. 0 651 096 880.

• Студэнтка шукае працу ў Беластоку, кніжка здароўя, санітарны мінімум, правы кат. В, тэл. 0 607 452 511.

• Мужчына (28 г.), сярэдня тэхнічная адукацыя, абслуга камп'ютэра, уласная машына, тэл. 0 605 867 565.

• Абітурыентка сацыялогі шукае працу ў Беластоку, абслуга камп'ютэра, санітарны мінімум, тэл. 0 698 285 964.

• Жанчына (27 г.), вышэйшая эканамічная адукацыя, правы кат. В, кніжка здароўя, фіскальная каса (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0 506 489 040.

• Мужчына (29 г.), механік з вопытам, падставовае веданне нямецкай і рускай моў, абслуга камп'ютэра, правы кат. В, тэл. 0 608 210 435.

• Студэнт III курсу архітэктуры шукае працу ў Беластоку, правы кат. В, добрае веданне англійскай мовы, абслуга камп'ютэра, тэл. 0 694 270 789.

• Студэнтка-завочніца шукае працу ў Беластоку, добрае веданне рускай мовы, абслуга камп'ютэра, тэл. 0 694 540 776.

• Малады мужчына, вышэйшая эканамічная адукацыя, правы кат. В, тэрмінова шукае працу ў Бельску-Падляшскім, тэл. 0 501 588 635.

• Механік (31 г.), шукае працу ў Беластоку, тэл. 0 605 717 708.

• Маладая жанчына (26 г.), добрае веданне нямецкай мовы, абслуга камп'ютэра, санітарны мінімум, кніжка здароўя, тэл. 0 506 345 798.

• Мужчына (27 г.), працоўны стаж у тэхнічным магазіне, санітарны мінімум, уласная машына, правы кат. В, тэл. 0 604 207 989.

• Студэнтка III курсу польскай філалогі і шукае працу ў Беластоку, правы кат. В, добрае веданне англійскай і рускай моў, абслуга камп'ютэра, тэл. 0 602 769 109.

• Жанчына, вышэйшая педагагічная адукацыя, правы кат. В, добрае веданне нямецкай мовы, шукае працу ў Беластоку, тэл. 0 505 433 545.

• Мужчына (35 г.), вышэйшая эканамічная адукацыя, правы кат. В, добрае веданне англійскай і нямецкай моў, абслуга камп'ютэра, тэл. 0 505 657 232.

• Жанчына (25 г.), вышэйшая юрыдычная адукацыя, правы кат. В, кніжка здароўя, фіскальная каса (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0 693 280 509.

• Маладая жанчына без дрэнных схільнасцей, працавітая, правы кат. В, добрае веданне камп'ютэра, шукае працу ў Бельску-Падляшскім, тэл. 0 694 957 365.

• Студэнтка ахвотна заапекуецца малым дзіцём, тэл. 0 508 820 414.

Дапамагаем сабе ўзаемна

У Бельску: 720 20 06

• Сям'я патрабуе пледаў, цёплага адзення для дзяцей ва ўзросце ад 5 да 13 гадоў.

• Сям'я з дзяцьмі ва ўзросце 5, 7, 9, 11 гадоў будзе ўдзячная за любую помач.

• Сям'я, якая выхоўвае пяцёра дзяцей, будзе ўдзячная за любую помач.

У Беластоку: 732 01 86
712 11 53

• Сям'я просіць дапамогі ў выглядзе старой мэблі і адзення для дзяцей ва ўзросце 7, 9, 12 і 13 гадоў.

• Сям'я, якая выхоўвае сямёра дзяцей, будзе ўдзячная за ўсякую дапамогу (адзенне, пасцель, старая мэбля).

• Сям'я з дзесяці асоб патрабуе пледаў, пасцелі, цёплага адзення.

• Тры сям'і з Відава, што каля Бельска-Падляшскага, з ахвотай аддадуць зімовыя курткі, мужчынскія і жаночыя штаны, світэры і іншае нязнішчанае адзенне, тэл. 730 40 00.

• Аддам дзіцячае адзенне ў добрым стане, тэл. 745 44 84.

Сабрала Паўліна Шафран-Асташэвіч

Падарунак

Ад некалькіх гадоў з'яўляюся я членам аднаго клуба, адкуль атрымоўваю заказаныя кніжкі ды тавары. Варта адзначыць, што ў клубе цэны даступныя. Дзякуючы гэтаму я карыстаюся лякарствам „Глюкозаміна" па цане больш чым напалову таннейшым як у аптэцы. Як кожная гандлёвая ўстанова так і клуб прыманьвае кліентаў падарункамі. Я атрымаў газавую запальнічку і цешыўся, бо гэта рэч прыдатная ў гаспадарцы. Але па сённяшні дзень не ведаю як ёю карыстацца — інструкцыя напісана на замежнай мове. А шкада.

Гандлёвыя фірмы, якія займаюцца распаўсюджваннем імпартных тавараў павінны задбаць, каб інструкцыя была на зразумелай карыстальніку мове. Тады будзе парадак. **(ус)**

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Nakład: 1 553 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Сакратар рэд.: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2004 r. upływa 5 września 2004 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2004 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,45 zł, a kwartalnie — 44,85 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

„Даўціпы"
Андрэя Гаўрылюка

— Ці твая мама не пагневаецца на цябе, што апранаеш такі мінімальны купальны касцюм? — пытаюць на пляжы маладую дзяўчыну.

— Безумоўна, бо гэта яе касцюм.

* * *

У час праліўнога дажджу ў краму ўбягае Янка з пытаннем:

— Выбачайце, ці ў гэтай краме не пакінуў хто парасона?

— Пакінуў. А як ён выглядае?

— Мне без разбору: абы быў!

* * *

Званок у дзверы:

— Адчыні, каханая.

— Не магу, бо я голая.

— Але я толькі адзін.

— Але я не адна.

* * *

— Ці паміж вамі часта ўзнікаюць рознагалоссі? — пытае псіхолаг сямейную пару.

— Яшчэ не здарылася такое: мая жонка на гэта не дазваляе.

* * *

— Ці часта ўміраюць хворыя ў вашай бальніцы?

— Толькі адзін раз.

* * *

На пустыні місіянер сустракае льва — жагнаецца і моліцца:

— Божа, учыні, каб гэтая істота набыла хрысціянскія пачуцці!

На гэта леў стае на калені, жагнаецца ды моліцца:

— Божа, паблаславі гэты дар, які зараз буду спажываць.

* * *

Француз пытае англічаніна:

— Чаму ваш флот заўсёды перамагае?

— Молімся за гэта Богу.

— Мы ж таксама молімся...

— Але мы молімся па-англійску.

* * *

Маладая дзяўчына збірае грошы на касцёл і звяртаецца за ахвярай да пажылога мужчыны.

— Каму прызначыце гэты грошы? — пытае ён.

— Богу.

— А колькі вам гадоў?

— Васемнаццаць.

— А мне вось восемдзесят і думаю, што сустрэнуся з Усявышнім раней за вас і таму захаваю грошы пры сабе.

Афарызмы Ладзіка Майніча

Творчасьць

Паэт надрукаваў новую нізку вершаў. Занадта нізка для высокай паэзыі — напісаў крытык.

*

Алькаголь станоўча адбіваецца на творчасьці і адмоўна на твары.

*

Літаратурны працэс пайшоў, а творцы чамусьці засталіся.

*

Тварыць на чужой мове гэтак жа цяжка, як падмятаць падлогу сваім языком.

*

Паэты ходзяць пятамі па лёзах
І мала думаюць пра блізкіх сьлёзы.

*

Творца без Тварца нібы песьня без канца.

*

Калі чытаеш чужыя афарызмы, так і карціць нешта скараціць.

Музычныя навіны

фота http://nrm.home.by

Пасля паспяховага выступу 31 жніўня ў клубе „Рэактар" **удзельнікі „Н.Р.М." вярнуліся да сольных праектаў**. Лявон зараз дапрацоўвае новую плітку „Крамбамбулі", якая з'явіцца ў продажы на пачатку кастрычніка, а Піт з Алезісам у складзе гурту „Гарадзкія" ад'ехалі з канцэртамі ў Польшчу і Літву.

Днямі ў продажы з'явілася перавыданне дэбютнага альбома „З новым годам!" (2001) гурту „Zet". Новае выданне дадаткова змяшчае тры новыя песні з дэма-запісаў 2003 года („Геадэзія-картаграфія", „Дзяржтэлерадыё", „Змяя"), а таксама вялікую мультымедыйную секцыю (кліп на песню „Калгас", канцэртнае відэа „Радзіма, свабода", тэксты, фотаздымкі).

Адзін з самых лепшых бубначоў у Беларусі Дзіма Харытановіч стварыў супольна з музычным прадпрыемствам „Leonity" калекцыю бубнавых палачак. На палачках прыгожа надрукаванае ягонае імя і прозвішча ды назва гурту, у якім зараз працуе — „Лепрыконсы". Віншуем. Нагадаю, Дзіма Харытановіч працаваў супольна з такімі гуртамі як „Hasta La Filista", пасля дапамагаў у стварэнні вялікай маладой надзейнай групы „Exist". Шырэй можна было з ім пазнаёміцца ў час першых канцэртаў гурту „Zet". Спосаб, у які бубніць Дзіма, можна заўсёды пазнаць — несамавіта роўна, даволі скочна і моцна, да таго нетыпова. У адпаведнасці са сваім Дзімаўскім стылем.

Татка Стэп

Заклік Толіка Кроліка

Ем я смачна, сплю салодка, віно папіваю —
Калі б хто спытаў зайздросна — жыву як у раю.
Нараблюся ў полі добра — падаю на ложак.
Кожны хай жыве як хоча і хто як сам зможа.
Іншы рольнік, хай і добры, звычна наракае,
Што яму граша на сплаты часта не хапае,
На падатак і „бычкова" ды на страхаванне
Каб якая дзе капейка! — не спіць аж да рання.
Мне, дай Божа, каб не горай, каб не саграшыці,
Яксьці ўсё вядзецца добра, ёсць есці і піці,
І каровы ўсе малочны, і куры яечны,
І бацькі — пенсіянеры, каб жылі навечна!
Адна болька, што пад коўдрай холадна адному,
Бо што гэта за ўцеха спаць ісці самому.
Вось, у „Ніўку" напісаў я, прасіць паратунку,
Каб знайшлі маю палову дзеля падмацунку
Усёй вясковай тэрыторыі ў новае часіне,
Бо калі кабет не будзе — вёска наша згіне,
Прападзе тады, людкове, уся наша нацыя,
А лясы, палеткі нашы зменяць у рэзервацыю!
Вось, тады старацца трэба, варушыць мазгамі,
Каб было найболей нашых, мяне разам з вамі.

Толік Кролік

Адгаданка

Кашэчы прытулак

(паліндрам)

За добрую навуку Лілі
Бацькі камп'ютэр ёй купілі.
А кот, што з Ліляю гуляе,
З куточка вусы настаўляе.

Згледзеў, як мышка рушыла хвастом
Дый цапнуў яе кіпцюром.
Зароў камп'ютэр як гудок
І драла даў _ _ _ / _ / _ _ _ _ _.

(ш)

Рашэнне паліндрама (у нашым выпадку з дзевяці літар) аднолькава чытаецца злева направа і справа налева.

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, разыграем кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 32 нумара

Агонь, бяда, бяльмо, восень, імя, кроў, мужчына, немец, Нім, памешчыца, удаў, Чыжы, шчырасць, Юнг.

Рашэнне: **Жанчыне на сем гадоў менш, чым гаворацьяе сяброўкі і на пяць больш, чым думаюць мужчыны.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Юліце Вярбіцкай** з Нараўкі і **Мікалаю Лук'янюку** з Бялкоў.

19.09 – 25.09

Баран (21.03. — 19.04.) 19 — 20.09. дагаворышся з усімі, аформіш справы. Маеш шанц сустрэць кагосьці, хто цябе зачаруе. Новапазнаныя асобы выклічуць у табе сімпатыю. Можаш знайсці саюзнікаў.

Бык (20.04. — 20.05.) Трыгон Венеры з Плутонам (22 — 26.09.) спрыяе наладжванню новых кантактаў, якія могуць ператварыцца ў палымяны раман. Ты цяпер здольны на адважныя фінансавыя рухі. Да 20.09. не бярыся за новыя справы. Зайграй у латарэю.

Блізняты (21.05. — 21.06.) З прычыны квадратуры Меркурыя з Плутонам (21 — 25.09.) старайся не змагацца і не накідаць іншым сваіх ідэй і волі, бо блага на гэтым можаш выйсці. Настроі і капрызы партнёра могуць вывесці цябе з раўнавагі. Знайдзі апору ў самім сабе. Стрэс можа паўплываць на праблемы са страўнікам.

Рак (22.06. — 22.07.) Шчасце ў каханні ў час трыгона Венеры з Плутонам (22 — 26.09). Карысны час і для мастацкай творчасці. Будзеш мець прызнанне. Пераможаш складанасці і цяжкасці.

Леў (23.07. — 22.08.) Калі 20 — 24.09. Сонца апынецца ў кан'юнкцыі з Юпітэрам, будзеш мець знакаміты настрой. Дасканала таксама і з фінансамі. Можаш патрабаваць спакою, каб глянуць на жыццё цэласна, а не як на збор фактаў, эмоцый і падзей.

Дзева (23.08. — 22.09.) У час апазіцыі Меркурыя з Вестай (20 — 24.09.) не стаў усяго на адну карту, бо можаш заблытацца ў сур'ёзныя клопаты. Пазбягай таксама пасвячэння сябе для кагосьці, каму твая дапамога непатрэбная. Пазбягай шматзначных, няясных і нервовых сітуацый.

Шалі (23.09. — 23.10.) Не забывай аб тым, што такія неабмежаваныя магчымасці маеш раз у 12 гадоў! Венера, якая ўваходзіць у твой знак 25.09. падзейнічае так, што пачнеш дыхаць поўнымі грудзьмі, адчуеш, што жывеш, што можаш шмат змяніць у сваім жыцці.

Скарпіён (24.10. — 21.11.) Ідэальны час на рамантычныя сустрэчы, прызнанні, шлюб — 22 — 26.09., калі Венера стварае трыгон з Плутонам. Глыбокае паразуменне душ з партнёрам.

Стралец (22.11. — 21.12.) 20 — 22.09. — прыліў энергіі, у гэтыя дні ўдасца табе амаль усё. Можаш змяніць фірму ці будзеш павышаны, але пойдуць за гэтым патрабаванні.

Казярог (22.12. — 20.01.) Пазбягай чаркі і машыны. Праз неба пачуццяў перасунецца цень з былога; патрэбныя будуць рашучыя вырашэнні. Могуць азвацца далёкія сваякі. Хтосьці з тваіх сяброў будзе мець праблемы з даўгамі ці здароўем; дапамажы яму ў сакрэце.

Вадалей (21.01. — 19.02.) Маеш нагоду здабыць немалыя грошы, выйграць у латарэю. Жар пачуццяў, проста вулкан — 22 — 26.09.

Рыбы 20.02. — 20.03.) Адпачывай не дома, а калі і нават, не бярыся за парадкі ды генеральны рамонт. Сувязь з асобай пазнанай 20 — 24.09. можа падтрымаць тваю самаацэнку; шмат у ёй будзе шчырасці. Можаш знайсці працу, якая дасць падзарабіць на даўжэйшы час.

Агата Арлянская

ISSN 0546-1960